Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 253 (6832) | 30 кастрычніка 1940 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР **Аб прысваенні звання Героя Соцыялістычнай Працы тт. Токараву Ф. В., Палікарпаву Н. Н., Шпітальнаму Б. Г., Грабіну В. Г., Якаўлеву А. С., Мікуліну А. А., Клімаву В. Я., Іванову І. І., Крупчатнікаву М. Я.**

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР **Аб узнагароджанні генерал-лейтэнанта інжынерных войск Карбышэва Д. М.**

III пленум Мінскага абкома КП(б)Б.

Выбарчая кампанія ў заходніх абласцях БССР.

АРТЫКУЛЫ:

А. Піцерскі — Ленін і Сталін у Кастрычніцкія дні.

Ц. Зеліксон-Баброўская — Нікалай Бауман (да 35-годдзя з дня смерці).

С. Бутомаў, С. Дняпроўскі — Палепшыць работу харчовай прамысловасці!

А. Рэгель — Даб'емся новых поспехаў.

В. Мігуцкі — Арганізаваць правільнае хаванне бульбы.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. **І. Чэпін** — Пачалася баявая вучоба. **С. Марозаў** — На агнявым рубяжы. **Я. Івашын** — Мы астаемся байцамі. **А. Фрайман** — Мітынг чырвонаармейцаў і сялян.

ЗА РУБЯЖОМ: Германскія паведамленні. Англійскія паведамленні. Сканчэнне перагавораў Гітлера з Мусаліні. Ваенныя дзеянні паміж Італіяй і Грэцыяй. Становішча ў Грэцыі. Нота італьянскага ўрада Грэцыі. Зварот англійскага караля і прэм'ера да караля і прэм'ера Грэцыі.

Чэсць і слава героям соцыялістычнай працы!

Сёння публікуецца Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб прысваенні звання Героя Соцыялістычнай Працы таварышам Токараву Ф. В., Палікарпаву Н. Н., Шпітальнаму Б. Г., Грабіну В. Г., Якаўлеву А. С., Мікуліну А. А., Клімаву В. Я., Іванову І. І. і Крупчатнікаву М. Я. Гэтыя таварышы, якія з'яўляюцца гордасцю нашай перадавой тэхнікі, узнагароджаны за выдатныя дасягненні ў галіне стварэння новых тыпаў узбраення, узнімаючых абаронную магутнасць Совецкага Саюза. Людзі перадавой навукі, перадавой тэхнічнай мысці, яны прадэманстрыравалі перад ўсёй краінай, перад усім многатысячным совецкім народам сваю выключную энергію, свае глыбокія пазнанні і свае буйныя канструктарскія таленты. Высокая ўзнагарода — званне Героя Соцыялістычнай Працы з'яўляецца достойнай ацэнкай іх працоўных подвігаў, іх безупынкай работы, накіраванай на карысць капіталістаў. Гэта ператварае іх працу ў зазорны цяжар. Адпаведным чынам выпрацоўваецца і псіхалогія чалавека, які імкнецца па магчымасці пазбавіцца ад працы. У нас, у СССР, наадварот, самай жаданай справай, заслугоўваючай шырокага грамадскага адабрэння, становіцца магчымасць быць героем працы, працы творчай, поўнакроўнай, бо толькі той, хто працуе, акружан у нас пачотам, любоўю і павагай.

Соцыялістычнае грамадства — гэта грамадства тружанікаў. Совецкі народ, які ліквідаваў паразітычныя, эксплаататарскія класы, бачыць у працы першы і асноўны абавязак грамадзяніна, разглядае працу, як справу чэсці, славы, доблесці і геройства. У нас няма і не можа быць адрозненняў, вызначаемых «благародным» паходжаннем і маемасным становішчам, але ў нас ёсць градацыя грамадскіх адрозненняў, аснованых на працоўнай характарыстыцы людзей: чым чалавек лепш працуе, чым больш карысці сваёй працай ён прыносіць, тым акружан ён большым пачотам і павагай.

Яшчэ ў 1918 годзе Ленін пісаў:

«Вучыцца працаваць — гэту задачу Совецкая ўлада павінна паставіць перад народам ва ўсім яе аб'ёме».

Годы, прайшоўшыя з таго часу, як былі сказаны гэтыя словы, наглядна паказваюць, што совецкі народ навучыўся працаваць па-сапраўднаму, яўляючы ўсяму свету найвышэйшыя ўзоры прадукцыйнасці. І гэта зноў-такі адбываецца таму, што працоўныя совецкай краіны знайшлі радасць працы, вызваленай ад пут капіталістычнай эксплаатацыі, і працуюць для сваёй карысці і для карысці дзяржавы, для пракбітання соцыялістычнага грамадства. Кожны, хто азірнецца вакол сябе, убачыць выдатныя рэзультаты свабоднай соцыялістычнай працы свабодных совецкіх людзей. Ён убачыць магутную соцыялістычную прамысловасць, убачыць фабрыкі і заводы, узнікшыя там, дзе раней ляжалі бяскрайнія пустыні. Ён убачыць магутныя машыны, апрацоўваючыя соцыялістычныя палі, — машыны, пабудаваныя на совецкіх заводах рукамі совецкіх людзей. Ён убачыць магутную Чырвоную Армію, узброеную першакласнай зброяй, зробленай на совецкіх заводах. Ён пачуе магутны гул матораў совецкай авіяцыі, убачыць тысячы і тысячы быстралётных машын, бараздзячых совецкае неба, і ўсе гэтыя машыны зроблены намі самімі, на нашых заводах.

Калісьці, у дарэволюцыйны час у хаду былі паклёпніцкія разважанні аб коснасці і лені рускага чалавека, нібы не ўмеючага працаваць. Жалкай хлуснёй выглядаюць гэтыя разважанні! Вялікая соцыялістычная рэволюцыя аслабаніла творчыя сілы народа, народ-багатыр пачуўся ва ўвесь свой рост і працуе з вялікай энергіяй, не паклапаючы рук, будуючы пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў светлы будынак комунізма.

Сіла і прытожасць соцыялістычнага ладу заключаюцца ў тым, што ў нас ніколі не спыняюцца на дасягнутым, а ідуць уперад, адкрываючы новыя шляхі, новыя дарогі. Наватарства ва ўсіх галінах навукі і тэхнікі — вось сапраўды знамённе нашага часу! Людзі перадавой навукі, якім зараз прысвоена высокае званне Героя Соцыялістычнай Працы, адзначыліся іменна таму, што яны з'яўляюцца наватарамі ў сваёй справе і працуюць на карысць самай святой для совецкіх патрыётаў справы — абароны нашай радзімы.

Чэсць і слава Героям Соцыялістычнай Працы — пракладальнікам новых шляхоў у навуцы і тэхніцы, беззаветным барацьбітам за далейшае працвітанне і ўмацаванне магутнасці соцыялістычнай бацькаўшчыны. Іх імёны звеяны непагаснай славай!

(Перадавы артыкул «Правды» за 29 кастрычніка).

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
Аб прысваенні звання Героя Соцыялістычнай Працы тт. Токараву Ф. В., Палікарпаву Н. Н., Шпітальнаму Б. Г., Грабіну В. Г., Якаўлеву А. С., Мікуліну А. А., Клімаву В. Я., Іванову І. І., Крупчатнікаву М. Я.

За выдатныя дасягненні ў галіне стварэння новых тыпаў узбраення, узнімаючых абаронную магутнасць Совецкага Саюза, прысвоіць званне **Героя Соцыялістычнай Працы** і ўручыць ордэн **Леніна і залатую медаль „Серп и Молот"**:

1. **Токараву Фёдару Васільевічу** (па стралковаму ўзбраенню).
2. **Палікарпаву Нікалаю Нікалаевічу** (па самалётах).
3. **Шпітальнаму Барысу Гаўрылавічу** (па авіяўзбраенню)
4. **Грабіну Васілію Гаўрылавічу** (па артылерыі).
5. **Якаўлеву Александру Сергеевічу** (па самалётах).
6. **Мікуліну Александру Александравічу** (па авіяматорах)
7. **Клімаву Владзіміру Якаўлевічу** (па авіяматорах).
8. **Іванову Ільі Іванавічу** (па артылерыі).
9. **Крупчатнікаву Міхаілу Якаўлевічу** (па артылерыі).

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 28 кастрычніка 1940 г.

Дэманстрацыя росквіту народнага мастацтва

Гутарка са старшынёй Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР тав. М. Б. ХРАПЧЭНКА

Дэкада бурат-мангольскага мастацтва, якая толькі што закончылася ў Маскве, з'явілася буйнай падзеяй у жыцці совецкага мастацтва, — сказаў старшыня Камітэта па справах мастацтваў пры Сёўнаркоме СССР тав. М. Б. Храпчэнка ў гутарцы з супрацоўнікам ТАСС.

— У дні дэкады са сцэны Вялікага тэатра СССР і яго філіяла прагучэлі выдатныя народныя напевы, былі выкананы танцы, захапляючыя сваёй красачнасцю і благароднствам. Гэта была дэманстрацыя першых і разам з тым вельмі значных поспехаў маладога мастацтва бурат-мангольскага народа.

Музыкальная драма «Баір» і опера «Энхэ-булат батор», цёпла прынятыя грамадскасцю сталіцы, паказалі сілу мастацтва, карэнні якога жывяцца жыватворчымі сокамі народнай творчасці. Энічныя творы бурат-мангольскага народа і яго музыкальны фальклор далі драматургам і кампазітарам багаты матэрыял для стварэння яркіх, праўдзівых і хвалюючых спектакляў.

Бурат-Мангольскі дзяржаўны музыкальна-драматычны тэатр у дні дэкады паказаў, што ён мае добры творчы калектыў, які, не гледзячы на сваю маладосць, здольны рашаць сур'ёзныя творчыя задачы. У яго саставе ёсць нямала адароных людзей.

Бурат-Мангольская АССР першай з рэспублік Расійскай федэрацыі вынесла сваю творчасць на ўсесаюзную трыбуну. Гэта выступленне адкрывае новую старонку ў гісторыі развіцця мастацтва бурат-мангольскага народа.

Дэкады нацыянальнага мастацтва ў Маскве сталі слаўнай традыцыяй. Яны не толькі дэманстрыруюць росквіт мастацтва асобнай рэспублікі, але і дапамагаюць намеціць шляхі для яго развіцця. У пачатку будучага года ў Маскве адбудзецца дэкада таджыкскага мастацтва, да якой ідзе дзейная падрыхтоўка. У 1941 годзе прадстаіць таксама паказ мастацтва маладых совецкіх рэспублік—Латвіі, Літвы і Эстоніі. У дні дэкад грамадскасць сталіцы пазнаёміцца з першымі новымі творамі мастацтва, створанымі народамі, пядаўна ўступіўшымі ў вялікую сям'ю народаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Услед за Бурат-Мангольскай АССР пакажуць сваю творчасць у Маскве і іншыя аўтаномныя рэспублікі, уваходзячыя ў састаў РСФСР. У будучым годзе праводзіцца дэкада татарскага мастацтва, а ў 1942 годзе — дэкада башкірскага мастацтва.

Усе гэтыя дэкады, таксама як і дзевяць прайшоўшых ужо дэкад, прадэманстрыруюць росквіт радаснай і жыццесцвярджаючай творчасці народаў СССР, якія пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна ствараюць вялікую соцыялістычную культуру. (ТАСС).

III пленум Мінскага абкома КП(б)Б

Учора пачаў работу III пленум Мінскага абкома КП(б)Б. З дакладам аб выкананні пастановы ЦК ВКП(б) ад 16 жніўня 1939 года выступіў сакратар абкома КП(б)Б па прапагандзе тав. Самарын.

Па абласці самастойна вывучаюць марксісцка-ленінскую тэорыю 26.000 чалавек, з іх 8.500—комуністы. 1.290 комуністаў ужо закончылі вывучэнне Кароткага курса і працуюць над першакрыніцамі.

— Асноўным недахопам у вывучэнні асноў марксізма-ленінізма,—гаворыць тав. Самарын,—з'яўляецца тое, што абсалютная большасць вывучаючых гісторыю партыі ўсё яшчэ працуюць над першымі раздзеламі «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Кантроль над самаадукацыяй комуністаў яшчэ не паднят на адпаведную вышыню. Абком партыі некалькі разоў ставіў на пасяджэнні бюро пытанне аб становішчы партыйнай прапаганды ў асобных раёнах, але ніколі не правяраў выканання сваіх рашэнняў. Таксама не правяралі выканання сваіх рашэнняў і райкомы КП(б)Б.

У многіх выпадках кіруючыя партыйныя работнікі не паказваюць прыкладу ў вывучэнні марксісцка-ленінскай тэорыі. Тав. Гурэвіч—сакратар Сталінскага райкома КП(б)Б гор. Мінска, тав. Казлоўскі—сакратар Кагановіцкага РК КП(б)Б не працуюць над сабой. Першы, па-сутнасці, не прыступаў да глыбокага вывучэння Кароткага курса, другі паспеў вывучыць адзін раздзел.

За 9 месяцаў толькі ў раённых цэнтрах абласці праведзена 220 лекцый у дапамогу вывучаючым Кароткі курс.

Па дакладу тав. Самарына разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя падверглі рэзкай крытыцы недахопы ў рабоце райкомаў і аддзела прапаганды і агітацыі абкома партыі.

Тав. Кац—загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Бягомльскага райкома—адзначыў, што аддзел прапаганды і агітацыі абкома мала дапамагае аддзелам прапаганды і агітацыі райкомаў. Тав. Кац прывёў прыклад, калі інструктар абкома тав. Фарбман, будучы ў раёне, не дапамагла нават скласці план работы аддзела прапаганды і агітацыі райкома.

Сакратар Смалявіцкага РК КП(б)Б тав. Гершман гаварыў аб рабоце лектарскай групы абкома.

— Лектары абкома, — сказаў ён, — не ведаюць састава слухачоў, не ведаюць, як яны вучацца, не знаёмы з іх агульнаадукацыйным узроўнем і т. д. Лектар прыязджае, прачытае лекцыю і вяртаецца назад.

Тав. Гершман узнімае пытанне аб тым, каб арганізаваць пры абкоме сістэматычную вучобу па павышэнню палітычнага і ў асаблівасці культурнага ўзроўню сакратароў райкомаў партыі.

Сакратар абкома ЛКСМБ па прапагандзе тав. Маслоўская гаварыла аб вывучэнні асноў марксізма-ленінізма комсамольцамі абласці.

За два годы комсамольская арганізацыя абласці пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі дабілася значных рэзультатаў у справе павышэння ідэйна-палітычнага ўзроўню кіруючых комсамольскіх работнікаў і актыва. Звыш 12.000 комсамольцаў самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Аднак, у палітычнай вучобе комсамольцаў ёсць пэлы рад істотных недахопаў. Адным з іх з'яўляецца тое, што абком і райкомы комсамола не дабіліся яшчэ, каб усе кіруючыя кадры комсамола авалодвалі асновамі марксізма-ленінізма. Слаба яшчэ арганізавана лекцыйная прапаганда. З красавіка 1940 года лектарскай групай абкома ЛКСМБ прачытаны толькі 23 лекцыі.

— Гаркомы і райкомы партыі, а таксама пярвічныя партарганізацыі, — заявіла тав. Маслоўская, — недастаткова кіруюць работай комсамольскіх арганізацый па вывучэнню марксісцка-ленінскай тэорыі. Не было яшчэ выпадку, каб гарком або райком КП(б)Б заслухаў справаздачу аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў комсамоле.

Загатчык аддзела прапаганды і агітацыі Мінскага гаркома КП(б)Б тав. Фішбейн гаварыў аб тым, што аддзел прапаганды і агітацыі абкома празмерна захапляецца пісаніной, залішнім патрабаваннем справаздач і зводак. Справа даходзіць да таго, што патрабуюць паіменныя спіскі займаючыхся ў гуртках на прадпрыемствах. У той жа час, у абласці амаль адсутнічае абагульненне вопыту партыйнай прапаганды.

Лектар абкома т. Саламаха адзначыў недастатковае кіраўніцтва з боку абкома лектарскай групай. За два годы існавання лектарскай групы абком КП(б)Б адзін раз рашыў заслухаць пытанне аб яе рабоце, ды і то зняў яго.

Па першаму пытанню выступілі таксама тав. Іваноў — сакратар Старадарожскага райкома партыі, тав. Сцяпанага — абком КП(б)Б, тав. Кацман — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Копыльскага райкома партыі, тав. Цырынскі — намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Слуцкага райкома і інш.

Пасля прыняцця рэзалюцыі па першаму пытанню пленум абкома заслухаў даклад сакратара абкома КП(б)Б тав. Лабанава аб ходзе выканання Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

18 параходаў выканалі план навігацыі

ГОМЕЛЬ, 29 кастрычніка. (БЕЛТА). Калектыў Днепра-Дзвінскага рэчнага параходства вядзе энергічную барацьбу за выкананне свайго перадсвяточнага абавязацельства—завяршыць навігацыйны план перавозак да XXIII гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. На 28 кастрычніка параходства выканала план навігацыі на 93,6 проц. па тонах і на 97,2 па тонакіламетрах.

Рад прыстаней ужо выканаў навігацыйны план: Лоеў—па 146,6 проц., Нароўля—125,7, Мозыр—109,9, Петрыкаў—104,9, Бабруйск—101,4 проц.

18 параходаў, у тым ліку 11 таварапасажырскіх, выканалі навігацыйны план. У першых радах—калектывы параходаў «Громаў», «Герой працы», «Владзімір Маякоўскі», «Сцяпан Разін», «Каманін», «Совецкая Беларусь» і іншыя

ПЕРШАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ЮБІЛЕЙНАЙ КАМІСІІ

НОВАГРУДАК, 29 кастрычніка. (БЕЛТА) Учора адбылося першае пасяджэнне юбілейнай камісіі па азнаменаванню 85-годдзя з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. Камісія заслухала даклад дырэктара Дома-музея імені Міцкевіча тав. Крынскага.

Дакладчык расказаў аб выключна вялікай цікавасці, якую праяўляюць працоўныя Совецкага Саюза да творчасці вялікага паэта.

З Масквы, Ленінграда, Харкава, Кіева, Львова і іншых гарадоў паступаюць шматлікія пісьмы з просьбай прысласць матэрыялы аб жыцці і літаратурнай дзейнасці Адама Міцкевіча.

На прадпрыемствах, ва ўстановах і школах раёна праводзяцца гутаркі аб творчасці паэта. Польскі кукальны тэатр і рад драматычных гурткоў горада рыхтуюць к 26 лістапада — дзе смерці паэта — новыя пастаноўкі, прысвечаныя памяці Адама Міцкевіча.

Юбілейная камісія ўвайшла з хадайніцтвам у Соўнарком БССР аб пасылцы ў Новагрудак групы пісьменнікаў для напісання брашуры — біяграфічнага нарыса аб жыцці і дзейнасці Адама Міцкевіча.

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ Ў ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БССР

Вялікі попыт на палітычную літаратуру

БЕЛАСТОК, 29 кастрычніка. (Кар. «Звязды»). У сувязі з выбарчай кампаніяй на кніжным рынку Беластока наглядаецца вялікае ажыўленне. Асабліва многа пакупнікоў у кніжных магазінах было ўчора, у выхадны дзень.

— Палажэнне аб выбарах ёсць?

— Канстытуцыю на яўрэйскай мове можна купіць?—пытаюць наперабой пакупнікі.

Выбарчай літаратуры ў магазінах дастаткова, і попыт пакупнікоў задавальняецца. Кніжны магазін № 1 КОГІЗа за апошнія два дні прадаў 3,5 тысячы брашур Палажэння аб выбарах і многа іншых кніг. Магазін атрымаў 4.000 плакатаў на выбарчыя тэмы. На іх таксама вялікі попыт. Работнікі магазіна ўкладваюць у сваю справу многа ініцыятывы. Імі падабраны 250 бібліятэчак—па 7—10 брашур—на выбарчыя тэмы. Ужо за выхадны дзень прадана 130 бібліятэчак. Пасля работы прадаўцы магазіна абходзяць выбарчыя ўчасткі і прапануюць літаратуру. Паступаюць сустрэчныя заказы.

Магазін № 2 КОГІЗ'а прадаў каля 4.000 экз. Палажэння аб выбарах, 400 тэматычных бібліятэчак і 250 плакатаў на рускай, беларускай, яўрэйскай і польскай мовах. Ім арганізаваны на час выбарчай кампаніі кніжныя кіёскі пры Доме партыйнай асветы, у клубе шарсцянікаў і пры выканкоме горсовета. За 6 месяцаў свайго існавання магазін рэалізаваў літаратуры на 289 тысяч рублёў

ГАРАДСКАЯ ІНСТРУКТЫЎНАЯ НАРАДА

28 кастрычніка ў памяшканні баранавіцкага абласнога драматычнага тэатра адбылася гарадская інструктыўная нарада ўсіх старшынь, сакратароў і членаў акруговых выбарчых камісій па выбарах у гарадскі і абласны Советы дэпутатаў працоўных. Каля 500 чалавек праслухалі інструктыўны даклад сакратара гаркома КП(б)Б тав. Дзенісевіча.

Удзельнікі нарады цікавіліся многімі пытаннямі практычнай работы.

АБЛАСНЫ СХОД ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

ВІЛЕЙКА. (Спец. кар. «Звязды»). Пры абласным Доме народнай творчасці адбыўся сход інтэлігенцыі, на якім прысутнічала звыш 300 чалавек.

З дакладам аб удзеле інтэлігенцыі ў выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных выступіў першы сакратар Вілейскага абкома КП(б)Б тав. Клімаў.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя на родных мовах тт. Амельяновіч — урач з Барыслаўскага раёна, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, Пытоўскі — інспектар аблана, Карэнчук — настаўнік з Пастаўскага раёна, Гурэвіч — настаўніца пяпоўнай сярэдняй школы гор. Вілейка, Врублеўскі — землеўпарадчык аблза, Батвінік — загадчык хаты-чытальні в. Шаркаўшчызны і інш. з радасным хваляваннем гаварылі аб вялікіх правах, якія атрымала працоўная інтэлігенцыя дзякуючы совецкай улазе і большэвіцкай партыі. Прамоўцы дзяліліся вопытам свайго ўдзелу ў грамадска-палітычнай рабоце сярод мясцовага насельніцтва.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі схода выказалі сваё гарачае жаданне і поўную гатоўнасць аказаць усямерную дапамогу партыйным, совецкім і грамадскім арганізацыям у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў. Прадстаўнікі інтэлігенцыі абласці абавязаліся: узначаліць гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у мясцовыя советы; праводзіць сярод выбаршчыкаў чытку газет, выбарчай літаратуры; выступаць з дакладамі, лекцыямі; дабіцца ўзорнай работы агітпунктаў; выпускаць пасценныя газеты пры кожным выбарчым участку; арганізаваць выстаўкі, вітрыны, наладжваць вечары мастацкай самадзейнасці і калектыўнае слуханне радыёперадач, прысвечаных выбарам у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Удзельнікі схода з вялікім уздымам паслалі прывітальную тэлеграму таварышу Сталіну.

Выбарчая кампанія ў заходніх абласцях БССР. Беластоцкі Дом партыйнай асветы арганізаваў кансультацыю для агітатараў выбарчых участкаў. На здымку: кансультант Дома партасветы М. А. Хмяльніцкая кансультуе агітатараў (злева направа): А. А. Максімлюка, А. А. Завадскога (15-я тэкстыльная фабрыка) і Х. Я. Кантаровіча (32-я ваціна-ватная фабрыка). Фото А. Сапіра. (Фотахроніка БЕЛТА).

Недахопы ў агітмасавай рабоце

БАРАНАВІЧЫ, 29 кастрычніка. (Кар. «Звязды»). Тысячы лепшых агітатараў абласці пачалі работу з першых-жа дзён выбарчай кампаніі. Тт. Скляроў, Філіпаў, Рында, Худзін, Ломнік і многія іншыя 1—2 разы ў тыдзень прыходзяць да выбаршчыкаў, расказваюць ім аб Сталінскай Канстытуцыі і выбарчым законе.

Аднак у радзе месц заўважаецца марудласць і непатрэбная «раскачка». У Ляхавіцкім раёне, напрыклад, некаторым агітатарам няма дзе працаваць. Гарадскі пасёлак да апошняга часу не быў разбіт на ўчасткі, асобныя агітатары не былі вызначаны ў гурткі. Праўда, можна было пачынаць агітацыю, не чакаючы стварэння выбарчых участкаў, але ў пачатку выбарчай кампаніі райком партыі і яго аддзел прапаганды і агітацыі захапіліся складаннем розных пасталоў і планаў, а разгортваннем агітацыйнай работы па месцах не кіравалі.

У Валеўкаўскім раёне ніхто дакладна не ведае, колькі агітатараў прыступіла да работы.

У Юрацішках некаторыя агітатары, як напрыклад т. Бартасевіч, самі яшчэ не вывучылі Палажэнне аб выбарах.

Ва многіх агіткалектывах адсутнічае выбарчая літаратура, што таксама значна перашкаджае ў арганізацыі агітацыйна-масавай работы. Выключную непаваротлівасць праяўляе ў гэтым баранавіцкае аддзяленне КОГІЗ'а. Яшчэ 7 дзён таму назад тут атрымалі 11 тысяч экземпляраў Палажэння аб выбарах у мясцовыя советы, але гэтая літаратура ўвесь час ляжала без руху на складзе КОГІЗ'а, і толькі сёння, пасля ўмяшання аддзела прапаганды і агітацыі абкома партыі, кіраўнік КОГІЗ'а тав. Маісееў паслаў яе ў раёны.

На абласці налічваецца 24 дамы сацкультуры і 224 хаты-чытальні. Але многія з іх дагэтуль яшчэ не сталі цэнтрам палітычнай агітацыі на вёсцы.

Ленін і Сталін у Кастрычніцкія дні

У студзені 1924 года на вечары крэмлёўскіх курсантаў, прысвечаным памяці Леніна, Сталін сказаў:

«Ленін быў народжан для рэволюцыі. Ён быў сапраўды геніем рэволюцыйных узрываў і найвялікшым майстрам рэволюцыйнага кіраўніцтва. Ніколі ён не адчуваў сябе так свабодна і радасна, як у эпоху рэволюцыйных патрасенняў... ніколі геніяльная празорлівасць Леніна не праяўлялася так поўна і выразна, як у часе рэволюцыйных узрываў. У дні рэволюцыйных паваротаў ён лігаральна расцвітаў, станавіўся яснабачным, прадугадваў рух класаў і магчымыя зігзагі рэволюцыі, бачачы іх, як на далоні».

Гэтыя словы з поўным правам трэба аднесці і да самога Сталіна, вернага вучня Леніна, бліжэйшага друга яго і саратніка.

Магутны геній правадыроў і стваральнікаў большэвіцкай партыі ў Кастрычніцкія дні 1917 года праявіў сябе ва ўсёй сіле. Партыя Леніна—Сталіна ў гэты рашаючы момант сусветнай гісторыі з честю вытрымала найвялікшае выпрабаванне, пераадолела ўсе цяжкасці. Яна злучыла ў агульны рэволюцыйны паток барацьбу рабочага класа за сацыялізм, сялянства за зямлю, прыгнечаных нацыянальнасцей за роўнапраўе, шырокіх мас народа за мір, дабілася звяржэння капіталізма і ўстанаўлення дыктатуры пролетарыята.

На VI з'ездзе (26-VII—3-VIII), кіруемым Леніным з падполля, па дакладах таварыша Сталіна былі прыняты гістарычныя рашэнні, нацэліўшыя партыю на ўзброенае паўстанне, на сацыялістычную рэволюцыю. Набліжаўся момант рашучай схваткі з буржуазіяй.

Канец верасня 1917 года характарызаваўся карэнным пераломам у развіцці рускай рэволюцыі. У краіне ўсё шырэй разлівалася хваля сялянскіх паўстанняў. Рабочыя, не абмяжоўваючыся стачкамі і дэманстрацыямі, пачыналі захватваць фабрыкі і заводы. Пасля разгрому карнілаўшчыны, у барацьбе з ёю ўмацаваліся захіраўшыя было Саветы і адзін за другім станавіліся большэвіцкімі. Уплыў нашай партыі рос не па днях, а па гадзінах. У верасні на выбарах у раённыя думы Масквы 51 проц. усіх выбаршчыкаў аддалі свае галасы большэвікам. На акраінах Расіі ўсё вышэй узнімаўся нацыянальна-вызваленчы рух.

Часовы ўрад ліхарадачна збіраў контррэволюцыйныя сілы і, рыхтуючы новую карнілаўшчыну, сцягваў да сталіцы казачыя дывізіі, ударныя батальёны, юнкераў, польскі і чахаславацкі корпусы. Керэнскія збіраліся ва што-б та ні стала разграміць рэволюцыйны пролетарыят і мелі намер аддаць Піцер немцам.

Адзіным выратаваннем з гэтага крызіса для Расіі быў выхад, указваемы большэвіцкай партыяй, Леніным, — пераход улады ў рукі Саветаў, сацыялістычная рэволюцыя. «Большэвікі могуць і павінны ўзяць дзяржаўную ўладу ў свае рукі»,— пісаў у сярэдзіне верасня 1917 года Ленін, які скрываўся ў падполлі ў Фінляндыі, Цэнтральнаму, Петраградскаму і Маскоўскаму камітэтам нашай партыі.

У другім пісьме, напісаным у гэтыя-ж дні, Ленін, развіваючы вывад аб неабходнасці ўзяцця большэвікамі ўлады, аналізіруе ўмовы, пры якіх паўстанне можа быць паспяховым. Ленін указвае, што паўстанне павінна апірацца «на перадавы клас», «на рэволюцыйны ўздым народа» і «на такі пераломны пункт у гісторыі нарастаючай рэволюцыі, калі актыўнасць перадавых радоў народа найбольшая, калі мацней за ўсё хістанні ў радах ворагаў і ў радах слабых пазавічатых нерашучых прыхільнікаў рэволюцыі». Гэтыя ўмовы ў верасні 1917 года былі ў наяўнасці ў Расіі.

Ленін развівае канкрэтны план паўстання, патрабуючы «аднесціся да паўстання па-марксісцку, г. зн. як да майстэрства». Гэта азначала, што, правільна выбраўшы момант паўстання, трэба было, не трацячы ні мінуты, «арганізаваць штаб паўстанцкіх атрадаў, размеркаваць сілы, рушыць верныя палкі на самыя важныя пункты, акружыць Александрынку, заняць Петрапаўлаўку, арыштаваць генеральны штаб і ўрад, паслаць да юнкераў і да дзікай дывізіі такія атрады, якія здольны загінуць, але не даць непрыяцелю рушыць к цэнтрам горада; мы павінны мабілізаваць узброеных рабочых, заклікаць іх да адчайнага апошняга бою, заняць адразу тэлеграф і тэлефон, змясціць наш штаб паўстання ля цэнтральнай тэлефоннай станцыі, звязаць з ім па тэлефону ўсе заводы, усе палкі, усе пункты ўзброенай барацьбы і т. д.».

Выступіўшы на пасяджэнні ЦК 15 (28) верасня таварыш Сталін поўнасцю падтрымаў палажэнні, развітыя Леніным, і прапанаваў разасласць ленінскія пісьмы для абмеркавання ў найбольш важныя арганізацыі партыі. Цэнтральны Камітэт адхіліў на гэтым пасяджэнні гнусную прапанову Каменева, — знішчыць ленінскія пісьмы.

У поўнай адпаведнасці з дырэктывамі Леніна, Сталін у цэнтральным органе партыі «Рабочий путь» вёў агітацыю за падрыхтоўку паўстання. Ленін тады ж даў выключна высокую ацэнку гэтай рабоце Сталіна і кіруючым сталінскім артыкулам у «Рабочем пути». З падполля Владзімір Ільіч безупынна падтрымліваў сувязь са Сталіным і ЦК. У гэтыя дні Владзімір Ільіч напісаў рад артыкулаў для «Рабочего пути» і большэвіцкага журнала «Просвещение», рад пісем у партыйныя камітэты, усебакова рыхтуючы партыю да паўстання. У сваіх пісьмах і артыкулах Ленін бічаваў Каменева, Зіноўева і іх адзінамышленікаў, якія прабавалі адцягнуць партыю з шляху ўзброенага паўстання.

У сувязі з нарастаннем падзей 3 (16) кастрычніка 1917 года ЦК большэвікоў дазволіў Ільічу «перабрацца ў Піцер, каб была магчыма пастаянная і песная сувязь». 7 кастрычніка Владзімір Ільіч на паравозе нелегальна прыехаў у Петраград і пасяліўся на кватэры Фафанавай на Выбаргскай стране. Праз некалькі гадзін 8 кастрычніка ў Владзіміра Ільіча быў Сталін. Сталін азнаёміў Ільіча са становішчам у Піцеры. Правадыры большэвіцкай партыі разам намецілі план далейшай падрыхтоўкі социялістычнай рэволюцыі. У гэты-ж дзень Владзімір Ільіч напісаў свае славутыя «Парады пастаронняга».

У класічных па сваёй сціслацці, канкрэтнасці і глыбіні радках Ленін даваў партыі ясныя і чоткія дырэктывы. У гэтыя-ж дні Ленін напісаў свае пісьмы піцерскай гарадской партыйнай канферэнцыі і большэвікам, прымаючым удзел па абласным з'ездзе Саветаў Паўночнай вобласці.

10 (23) кастрычніка 1917 года Ленін паявіўся на пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта. Члены ЦК радасна віталі свайго настаўніка і друга. Ленін выступіў на гэтым гістарычным пасяджэнні ЦК з дакладам па бягучаму моманту. Владзімір Ільіч указаў, што «палітычная справа зусім назрала для пераходу ўлады...» і патрэбаваў усебаковай тэхнічнай падрыхтоўкі паўстання. Прапанаваная Леніным рэзалюцыя аб узброеным паўстанні была прынята ўсімі галасамі супроць галасоў здраднікаў — Каменева і Зіноўева, прадракаўшых паўстанню паражэнне і паклёпніцка сцвярджаўшых, што ў рабочага класа няма сіл для ўзяцця ўлады. Іудушка-Троцкі на гэтым пасяджэнні ўнёс здрадніцкую прапраўку, прапанаваўшы адкласці пачатак паўстання, адтэрмінаваць яго да адкрыцця II з'езда Саветаў. Гэта азначала — расшыфраваць дзень паўстання Часоваму ўраду і даць контррэволюцыі магчымасць сабраць свае сілы. ЦК адхіліў гэтую здрадніцкую «папраўку».

Большэвіцкая партыя, падрыхтоўваючы ўзброенае паўстанне, вяла актыўную работу па мабілізацыі ўсіх сіл пролетарскай рэволюцыі. 13 (26) кастрычніка 1917 года ў цэнтральным органе партыі «Рабочий путь» Сталін у артыкуле «Улада Саветаў», звяртаючыся да рабочых, салдат і сялян, пісаў: «Надышоў момант, калі рэволюцыйны лозунг «Уся ўлада Саветам» павінен быць, нарэшце, ажыццёўлен». ЦК большэвіцкай партыі разаслаў на месцы ўпаўнаважаных для арганізацыі паўстання. 12 (25) кастрычніка па дырэктыве партыі пры Петраградскім Совеце быў створан Ваенна-рэволюцыйны камітэт, які стаў легальным штабам паўстання. Ленін і Сталін усе дні непасрэдна кіравалі яго работай.

16 (29) кастрычніка адбылося, склікане па прапанове Леніна, расшыранае пасяджэнне ЦК партыі. Владзімір Ільіч выступіў з дакладам аб рашэнні ЦК ад 10 кастрычніка. Свой даклад Ільіч закончыў словамі: «З палітычнага аналіза класавай барацьбы і ў Расіі і ў Еўропе вынікае неабходнасць самай рашучай, самай актыўнай палітыкі, якая можа быць толькі ўзброенае паўстанне».

Каменеў і Зіноўеў на гэтым пасяджэнні зноў выступілі супроць узброенага паўстання. Гэтыя капітулянты і здраднікі былі выкрыты таварышам Сталіным: «Тое, што прапануюць Каменеў і Зіноўеў, аб'ектыўна прыводзіць да магчымасці для контррэволюцыі зарганізавацца». На гэтым жа пасяджэнні па прапанове Леніна быў выбран Партыйны цэнтр па кіраўніцтву паўстаннем на чале з таварышам Сталіным.

У той-жа дзень і затым на наступны— 17 (30) кастрычніка Владзімір Ільіч напісаў пісьмо «К товарищам», у якім зло высмеяў капітулянцкія довады Каменева і Зіноўева супроць паўстання. Але гнусныя штрэйкбрэхеры рэволюцыі працягвалі [illegible]жэнне ў сваіх спробах перашкодзіць прыняццю ленінскага плана паўстання, зрабілі новае нечуванае здрадніцтва. 18 кастрычніка яны выступілі ў меншавіцкай газеце «Новая жизнь» супроць большэвіцкай партыі і яе ЦК, раскрыўшы буржуазіі сакрэтнае рашэнне партыі аб паўстанні. Гэта было здрадай, пагражаўшай сарваць падрыхтоўваемае паўстанне, прамой дапамогай контррэволюцыі. Ленін рэзка закляймёў штрэйкбрэхерства Каменева і Зіноўева і паставіў перад ЦК пытанне аб выключэнні абодвух здраднікаў з партыі.

Папярэджаны штрэйкбрэхерамі ўрад Керэнскага стаў прымаць меры, каб задушыць падрыхтоўваемае паўстанне. Усе сілы контррэволюцыі былі мабілізаваны. Керэнскі распрацаваў план разгрому большэвікоў напярэдадні II з'езда Саветаў, назначанага на 25 кастрычніка (7 лістапада). Але кіруемая Леніным і Сталіным большэвіцкая партыя паскорыла збіранне рэволюцыйных сіл. 12.000 чырвонагвардзейцаў былі падрыхтаваны да выступлення па першаму закліку партыі. З Петраградскай крэпасці для чырвонагвардзейцаў была вывезена зброя. Ваенна-рэволюцыйны камітэт назначыў сваіх камісараў ва ўсе воінскія часці. Лік гэтых камісараў быстра дасягнуў 600 чалавек. Без санкцыі Ваенна-рэволюцыйнага камітэта і яго камісараў загады камандавання ў часцях не выконваліся. Планы Часовага ўрада былі вядомы ЦК большэвікоў. 21 кастрычніка (3 лістапада) на пасяджэнні ЦК па прапанове Сталіна было рашана даручыць Леніну падрыхтаваць асноўныя даклады і рашэнні II з'езда Саветаў: аб міры, аб зямлі і аб уладзе. ЦК даручыў Сталіну і Свердлову кіраўніцтва большэвіцкай фракцыяй з'езда Саветаў, Сталіну і Дзержынскаму—кіраўніцтва работай у Петраградскім Выканаўчым Камітэце Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Падрыхтоўка паўстання ішла поўным ходам.

На пасяджэнні Петраградскага Совета Троцкі здрадніцка выбалтаў тэрмін паўстання ворагам, і ЦК рашыў пачаць паўстанне раней—24 кастрычніка (6 лістапада).

У гэты дзень з раніцы Керэнскі пачаў сваё выступленне супроць большэвікоў. У 6 гадзін юнкеры ўварваліся ў рэдакцыю і друкарню цэнтральнага органа большэвікоў «Рабочий Путь». На выручку «Рабочего Пути» па ўказанню таварыша Сталіна рушылі браневікі знаходзіўшагася пад уплывам большэвікоў аўта-бронедывізіёна і Чырвоная гвардыя. Рэдакцыя і друкарня былі быстра адбіты, і к 11 гадзінам раніцы быў выпушчан чарговы нумар «Рабочего Пути». У перадавым артыкуле «Што нам трэба», напісаным Сталіным, партыя заклікала да звяржэння Часовага ўрада.

У Смольным адбылося пасяджэнне ЦК большэвікоў. ЦК даручыў Дзержынскаму забяспечыць заняцце пошты і тэлеграфа, Свердлову—назіраць за кожным крокам Часовага ўрада. Рашана было неадкладна выклікаць флот і маракоў з Кранштата. Паўстанне разгортвалася па плану, намечанаму Владзімірам Ільічом.

Ленін у гэты час знаходзіўся на кватэры Фафанавай. На пасланае ім праз Выбаргскі раённы камітэт запытанне аб магчымасці яго прыбыцця ў Смольны Сталін адказаў, што зараз выходзіць небяспечна. У гэтыя гадзіны Ленін напісаў сваё славутае пісьмо членам ЦК з патрабаваннем:

«Ні ў якім выпадку не пакідаць улады ў руках Керэнскага і кампаніі да 25-га, ніякім чынам; рашаць справу сёння абавязкова вечарам або ноччу».

Сталін і Цэнтральны Камітэт дакладна выконвалі гэтую дырэктыву Леніна.

Вечарам Владзімір Ільіч, пагарджаючы небяспекай, загрыміраваўшыся, пайшоў у Смольны, пакінуўшы сваёй гаспадыні запіску: «Пайшоў тулы, куды Вы не хацелі, каб я ішоў. Да пабачэння. Ільіч».

Разам са Сталіным Ленін узяў у свае рукі непасрэднае кіраўніцтва ўзброеным паўстаннем.

Кастрычніцкая рэволюцыя пачалася, і адразу прышлі ў рух атрады арганізаваных большэвікамі байцоў. У ноч з 24 на 25 кастрычніка (7 і 8 лістапада) былі заняты вакзалы, масты, пошта, тэлеграф міністэрствы, Дзяржаўны банк. Да раніцы амаль увесь горад быў у руках паўстаўшых рабочых і салдат. У 10 гадзін раніцы 25 кастрычніка (7 лістапада) Владзімір Ільіч напісаў славуты зварот да грамадзян Расіі:

«Часовы ўрад скінут. Дзяржаўная ўлада перайшла ў рукі органа Петраградскага Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў— Ваенна-рэволюцыйнага камітэта, стаячага на чале петраградскага пролетарыята і гарнізона».

У гэтыя гістарычныя гадзіны і дні, узрушыўшыя свет, Ленін і Сталін у самым цэнтры паўстання разам кіравалі Кастрычніцкай рэволюцыяй, накіроўваючы і арганізуючы рэволюцыйныя атрады пролетарыяў, матросаў і салдат на штурм Зімняга палаца, даючы дырэктывы аб паўстанні на месцы, звязваючыся з большэвікамі ва ўсіх канцах Расіі. Радыёстанцыя крэйсера «Аврора», першая большэвіцкая радыёстанцыя, ужо кідала ў эфір палкія словы аб новай пролетарскай уладзе, аб толькі што нарадзіўшайся дыктатуры пролетарыята. У 2 гадзіны 30 мінут дня 25 кастрычніка (7 лістапада) у Смольным адкрылася экстранае пасяджэнне Петраградскага Совета. Бурай захаплення сустрэў зал Леніна. Владзімір Ільіч выступіў з дакладам аб задачах улады Саветаў. Ён гаварыў:

«Рабочая і сялянская рэволюцыя, аб неабходнасці якой увесь час гаварылі большэвікі, адбылася».

Вечарам у Смольным адкрыўся II з'езд Саветаў. Ленін напісаў зварот з'езда «Да рабочых, салдат і сялян», які аб'яўляў аб пераходзе ўсёй улады ў рукі Саветаў. Гэты зварот быў прынят з'ездам з велізарным патхненнем. Ленін і Сталін на вячэрнім пасяджэнні з'езда 25 кастрычніка прысутнічаць не маглі. Правадыры Кастрычніцкай рэволюцыі кіравалі арганізацыяй штурма Зімняга палаца і былі заняты вырашэннем надзённейшых для рэволюцыі пытанняў аб забеспячэнні Піцера хлебам. Хлеба ў сталіцы асталося на два дні. Контррэволюцыя хацела голадам задушыць паўстаўшы пролетарыят.

Ленін і Сталін арганізавалі некалькі ўзброеных атрадаў, якія абыскалі ўсе чыгуначныя пуці і вакзалы і выявілі дзесяткі вагонаў з хлебам. Гэта забяспечвала горад па некаторы тэрмін харчамі.

Напружаная работа Леніна і Сталіна ў Смольным прадаўжалася ўсю ноч. У трэцяй гадзіне раніцы 26 кастрычніка (8 лістапада) чырвоны сцяг Саветаў узвіўся і над Зімнім палацам.

26 кастрычніка (8 лістапада) раніцой Ленін напісаў дэкрэт аб зямлі. У гэты-ж дзень Ільіч разам са Сталіным правёў пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта, які абмеркаваў пытанне аб саставе першага Совецкага ўрада. Калі нехта з прысутных стаў адмаўляцца ад назначэння на пост народнага камісара, спасылаючыся на адсутнасць вопыту, Владзімір Ільіч заразіцельна рассмяяўся: «А вы думаеце ў каго-небудзь з нас ёсць такі вопыт?»

У 9 гадзін вечара 8 лістапада адкрылася другое пасяджэнне з'езда Саветаў. Цяжка перадаць захапленне, з якім дэлегаты сустрэлі Леніна. Побач з Владзімірам Ільічом стаяў і яго бліжэйшы друг і саратнік—Сталін. На гэтым гістарычным начным пасяджэнні з'езда па дакладах Леніна былі прыняты дэкрэты аб міры, аб зямлі і ўтворан першы Совецкі ўрад. Ленін быў выбран Старшынёй Совета Народных Камісараў, Сталін—Старшынёй па справах нацыянальнасцей. Пазней, у канцы 1917 года, у дні, калі Ленін адсутнічаў у Соўнаркоме, яго замяшчаў на пасту Старшыні Сталін.

27 кастрычніка (9 лістапада), на трэці дзень Кастрычніцкай рэволюцыі, Ленін і Сталін жалезнай рукой арганізоўвалі абарону Петраграда ад войск Керэнскага, які ўзяў Гатчыну. Разам са Сталіным Владзімір Ільіч з'явіўся ў штаб рэволюцыйных войск, праверыў план абароны і ўнёс у яго істотныя папраўкі. «Урад рабочых і сялян жадае ведаць, як дзейнічаюць яго ваенныя ўлады»,—заявіў Ільіч у штабе. Усё было паднята партыяй на справу абароны рэволюцыйнага Піцера. Вечарам Владзімір Ільіч разгаварваў па прамому проваду з Гельсінгфорсам і выклікаў у Петраград ваенныя судны Балтыйскага флота.

9 лістапада цэнтральны орган партыі зноў вышаў пад слаўнай старой баявой большэвіцкай назвай «Правда».

Смольны ззяў у гэтую ноч тысячамі агнёў. Штаб социялістычнай рэволюцыі вёў гіганцкую работу па разгортванню барацьбы за пераход улады ў рукі Саветаў ва ўсёй краіне. Да Леніна і Сталіна бесперапыннай чарадой ішлі рабочыя, салдаты, матросы, сяляне, народныя камісары і члены ВЦВК. Адсюль, з пакоя ў Смольным, ва ўсе канцы краіны—у Маскву і на Урал, у Кіеў і на Волгу ішлі ленінскія ўказанні, дырэктывы, дэкрэты, адсюль накіраваліся на месцы пасланцы партыі, каб рухаць уперад справу социялістычнай рэволюцыі.

У вялікім садружестве кіравалі Ленін і Сталін большэвіцкай партыяй і пролетарскай рэволюцыяй. Геній рэволюцыйнай барацьбы, правадыры комунізма ўзнялі партыю, мабілізавалі яе, накіравалі на ўзброенае паўстанне. Партыя павяла за сабой рабочы клас і шырокія масы беднацкага сялянства, і вялікая перамога Кастрычніцкай Социялістычнай Рэволюцыі—звяржэнне ўлады капіталістаў і ўстанаўленне дыктатуры пролетарыята—была атрымана.

Пачалася новая глава сусветнай гісторыі чалавецтва.

А. ПІЦЕРСКІ.



В. І. Ленін і І. В. Сталін у Смольным, 1917 г. Рысунак мастака П. В. Васільева.

НА ТЭМЫ ДНЯ

Больш увагі падрыхтоўцы механізатараў

У БССР ёсць 18 школ рэспубліканскага і абласнога падпарадкавання, якія рыхтуюць камбайнераў, ільноцерабільшчыкаў, брыгадзіраў трактарных брыгад і механікаў МТС.

Заняткі ў гэтых школах пачаліся з далёка няпоўным саставам вучняў. Навучаецца толькі 1.000 чалавек замест 3 тысяч па плану. Напрыклад, у Старасельскай школе (Віцебская вобласць) вучыцца ўсяго 4 ільноцерабільшчыкі з 33 па плану. У Смілавіцкую школу (Мінская вобласць), якая рыхтуе камбайнераў, прыбылі на вучобу толькі 13 чалавек замест 169.

Дзяржава стварыла ўсе ўмовы для абучэння сельскагаспадарчых механізатарскіх кадраў у рэспубліцы. Ёсць добра абсталяваныя школы, курсантам вызначана высокая стыпендыя. У Рагачоўскай школе механікаў курсантам выплачваецца 200 рублёў у месяц стыпендыі. Будучыя камбайнеры і ільноцерабільшчыкі ва ўсіх школах атрымліваюць па 120 рублёў стыпендыі.

Паўстае пытанне: чаму-ж школы поўнасцю не ўкамплектаваны, і зрываецца своечасовая і высокаякасная падрыхтоўка механізатарскіх кадраў? Адказ на гэта можа быць адзін: у зямельных органах і ў МТС, якія павінны пасылаць людзей на вучобу, няма клопатаў аб стварэнні высококваліфікаваных працоўных рэзерваў.

Вясною і летам некаторыя дырэктары МТС усякія непаладкі ў рабоце перш за ўсё аб'ясняюць адсутнасцю добра падрыхтаваных кадраў. А цяпер, калі прышла пара вучыць і падрыхтоўваць кадры, яны зусім мала цікавяцца гэтым.

Толькі злачынная нядбайнасць радуа дырэктараў МТС і зямельных органаў Віцебскай абласці можна аб'ясніць той факт, што абласць накіравала на вучобу ўсяго 5 камбайнераў і 4 ільноцерабільшчыкаў замест 203 чалавек па плану.

У многіх МТС Палескай абласці няма механікаў, але ёсць вопытныя брыгадзіры трактарных брыгад, вырасшыя на рабоце. Яны, прайшоўшы курс тэарэтычнага навучання, змаглі-б быць першакласнымі механікамі. Аднак у абласці не змаглі падабраць 14 чалавек, каб паслаць іх на вучобу ў школу механікаў.

Аблясныя зямельныя аддзелы не патрабавалі ад дырэктараў МТС выканання плана камплектавання школ. У выніку ў 18 школах займаецца толькі 12 камбайнераў з 290 па плану і 5 ільноцерабільшчыкаў замест 82.

Трэба сказаць, што Наркамзем БССР у гэтай важнейшай справе выступае ў ролі рэгістратара фактаў. Аддзел кадраў Наркамзема нічога не зрабіў, каб дабіцца поўнага выканання плана падрыхтоўкі механізатарскіх кадраў.

За зіму школы павінны падрыхтаваць 6.500 чалавек — камбайнераў, ільноцерабільшчыкаў, брыгадзіраў трактарных брыгад і механікаў. Каб справіцца з гэтай задачай, трэба рашуча змяніць адносіны да камплектавання школ, патрабаваць ад дырэктараў МТС і зямельных органаў дакладнага выканання плана пасылкі людзей у школы, асабліва жанчын.

Школы механізатараў павінны мець поўны кантынгент навучаючыхся.

★

Забяспечыць школы палівам

Мінулы вучэбны год школы рэспублікі закончылі са значнымі прабеламі ў выкананні вучэбнай праграмы. У поўнай мерэ на гэта аказала ўплыў дрэннае апаленне памяшканняў. У асобных школах Мінска, Віцебска зрываліся заняткі толькі таму, што не было паліва. Арганізацыі, якія павінны былі своечасова забяспечыць школы палівам, адклалі гэту важнейшую справу да наступлення самай дарогі.

Сёлета многія кіраўнікі раёнаў, старшыні сельсоветаў і калгасаў, дырэктары школ зразумелі ўсю важнасць своечасовай загатоўкі і вывазкі дроў, улічылі ўрокі мінулай зімы і поўнасцю забяспечылі школы палівам. Школы Магілева, Брэсціны забяспечаны дрывамі на ўвесь вучэбны год.

Але ў многіх мясцах паўтараецца мінулагодняя гісторыя. Па Мінскай вобласці няма паліва ў 100 школах. Асабліва трывожнае становішча ў Крупскім раёне ў большасць школ не завезена ні аднаго кубаметра дроў. У Рудзенскім раёне 20 школ не маюць паліва, Старобінскім— 10.

Не лепш і ў Віцебскай абласці. У школы Полацкага раёна з неабходных па гадавому плану 6 тысяч кубаметраў дроў завезена 2.200 кубаметраў. Па Гарадоцкаму раёну з патрэбных 5.372 кубаметраў вывезена толькі 958. Вельмі дрэнна з загатоўкай паліва ў Бешанковіцкім раёне. Напрыклад, сярэдняя беларуская школа ў раённым цэнтры мае ўсяго толькі 50 кубаметраў дроў з патрэбных 400. Не забяспечаны палівам і школы гор. Віцебска.

Забеспячэнне школ палівам — адна з неадкладных задач. Класныя памяшканні, лабараторыі, спартыўныя залы павінны быць апалены і поўнасцю прыстасаваны да заняткаў. Нельга дапусціць, каб хоць адзін дзень вучобы ў школе быў страчаны з-за адсутнасці паліва.

ДАБ'ЕМСЯ НОВЫХ ПОСПЕХАЎ

Перад пачаткам вучэбнага 1940-41 года мы правялі рад мерапрыемстваў, якія забяспечылі нармальную работу нашай школы. Дэтальна вывучылі Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня, распрацавалі і зацвердзілі на педагагічным совеце календарны план палітыка-выхаваўчай і метадычнай работы на першую чвэрць і абмеркавалі рад іншых пытанняў, звязаных з чоткай арганізацыяй вучобы. Правялі нарады секцый настаўнікаў родственных прадметаў па пытанню аналіза планаў іх работы.

У выніку значнай падрыхтоўчай работы вучоба ў гэтым годзе характарызуецца большай арганізаванасцю, чым у мінулым. Поўнасцю ліквідаваны прагулы і спазненні на работу настаўнікаў і адміністрацыйна-тэхнічнага персанала, па мінімума скарацілася спазненні вучняў на ўрокі, палепшылася дысцыпліна, павысілася паспяховасць.

Асноўным метадам работы настаўніцкага і вучнёўскага калектыва з'яўляецца социялістычнае спаборніцтва. У пачатку вучэбнага года мы заключылі социялістычны дагавор з 9 сярэдніх школай. Кожны настаўнік узяў на сябе абавязацельства добраякасна абучаць дзетвару, выканаць указанні партыі і ўрада аб ліквідацыі другагодніцтва. Былі ўлічаны памылкі мінулых год, калі пры падвядзенні вынікаў спаборніцтва фармальна правяралі лічбавыя паказальнікі.

Зараз мы арганізавалі ўзаемнае наведванне школы, урокаў, праводзім сумесна пасяджэнні педсоветаў, секцый. Вялікую ўвагу ўдзяліў педагагічны калектыў социялістычнаму спаборніцтву паміж класамі і вучнямі. З гэтай мэтай у кожным класе выпускаецца спецыяльны бюлетэнь, у якім штодзённа падводзяцца вынікі спаборніцтва.

Педагог — цэнтральная фігура ў арганізацыі педагагічнага працэса, і паспяховасць вучняў у многім залежыць ад яго ўмення правільна арганізаваць работу класа, пабудаваць урок. Улічваючы гэта, дырэкцыя прыклала ўсе намаганні да павышэння педагагічнай кваліфікацыі настаўнікаў. Арганізаван педагагічны гурток, якім кіруе загадчык вучэбнай часткі малодшых класаў тав. Мерзон. У гуртку настаўнікі знаёмяцца з навейшай метадычнай літаратурай. Яны сістэматычна наведваюць педагагічны кабінет, абмеркоўваюцца вопытам работы, часта практыкуюцца адкрытыя ўрокі.

У гэтым годзе мы асаблівую ўвагу звярнулі на якасць ведаў вучняў. Настаўнікі не абмяжоўваюцца толькі правядзеннем урока, фармальным выстаўленнем адзнак, а дапамагаюць вучням глыбока засвайваць матэрыял. У гэтых адносінах вялікую ролю адыгралі гурткі па матэматыцы, рускай і беларускай мовах, хіміі, біялогіі, арганізаваныя для адстаючых вучняў. Настаўнікі тт. Парафенюк, Правільшчыкава, Масквічова, Гулякевіч, Шлеймовіч пасля ўрокаў астаюцца ў школе і займаюцца з вучнямі, якія не ўсвоілі праграмны матэрыял.

Калектыў школы ўдзяляе вялікую ўвагу разгортванню пазашкольнай работы. Працуюць харавы, драматычны гурткі, гурток мастацкай вышыўкі, якім кіруе настаўніца тав. Парафенюк.

У мінулым годзе наша школа па абаронной работе заняла другое месца ў Саюзе і атрымала прэмію 2.000 рублёў. Мы рашылі яшчэ лепш арганізаваць справу, і вынікі аказаліся нядрэннымі. У агульнагарадскіх процівапаветраных вучэннях група самаабароны школы паказала высокія ўзоры дысцыплінаванасці і выучкі. Зараз у нас арганізаван рад ваенных гурткоў, якімі кіруюць настаўнікі-вучні. Нармальна працуюць 5 гурткоў «БГСА», заняткі ў якіх вядуць вучні-байцы санітарнага звяна: Харытонава, Канашук, Паронак. Працуюць 6 каманд вучняў 10-х класаў. Яны рыхтуюцца да здачы норм на значок «Ворошиловский стрелок» па новай комплекснай праграме. Заняткі па тапаграфіі праводзяць удзельнікі ўсесаюзных абаронных спаборніцтваў піянераў і школьнікаў Барышанскі і Крывенда. Дзяўчаты 9-га і 10-га класаў рыхтуюцца стаць інструктарамі «ГСА» першай і другой ступені. Усёй ваеннай вучобай кіруе энтузіяст абаронной работы настаўніца тав. Правільшчыкава.

Вялікую дапамогу школе ў наладжванні свядомай дысцыпліны і арганізацыі адпачынку вучняў аказвае бацькоўскі актыў, у асаблівасці старшыня бацькоўскага камітэта тав. Мажушок.

Праведзены першыя вынікі работы школы з пачатку вучэбнага года. Рэзультат атрымаўся нядрэнны. Аднак дырэкцыя і педагагічны калектыў яшчэ многага не зрабілі ў справе навучання і выхавання. Ёсць у нас вучні, якія далёка не сур'ёзна адносяцца да вучобы, дрэнна вядуць сябе на ўроках.

Наш калектыў сур'ёзна абмеркаваў гэтыя прабелы і намеціў рад мер да іх знішчэння. Пры сумеснай дружнай работе дырэкцыі, настаўнікаў, партыйна-комсамольскай арганізацыі школы і бацькоў мы даб'емся ўзорнага выхавання і навучання дзетвары.

А. В. РЭГЕЛЬ,
заг. вучэбнай часткі 47 сярэдняй школы гор. Мінска.

Спаборніцтва васілевіцкіх лесарубаў

9 год працуе на лесазагатоўках пастаянная брыгада калгаснікаў сельскагаспадарчай артэлі імені Молатава, Васілевіцкага раёна. Усе 13 чалавек з'яўляюцца стаханаўцамі. Яны паказваюць узоры социялістычнай працы. План трэцяга квартала брыгадай выканан па 430 проц., загатоўлена 2.154 кубаметры лесу.

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае социялістычнае спаборніцтва, лесарубы тт. Гурскі, Дзйкун П., Белы, Дзйкун С. і іншыя выконваюць свае нормы ў сярэднім кожны дзень на 200—300 процантаў.

ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ!

Харчовая прамысловасць БССР працуе задавальняюча. За 9 месяцаў бягучага года прадпрыемствы ўсходніх абласцей выканалі план выпуску прадукцыі на 95,6 проц. За дзевяць месяцаў бягучага года кажывец недатрымаў 680 тон расліннага масла, 3.448 тон дражджэй, 19 тысяч літраў піва, тысячы тон розных кандытарскіх вырабаў.

Кіраўнікі многіх прадпрыемстваў і трэстаў БССР аб'ясняюць невыкананне плана рамам незалежачых ад іх прычын. Кандытарскія фабрыкі мелі перабоі з-за недахопу сыравіны: у другім квартале прастоі дасягнулі салідная лічбы—35.106 чалавекадзён. Дражджавыя заводы стаялі з-за перабояў у падачы электраэнергіі, з-за адсутнасці паліва. Гэта адбілася на выхадзе дражджэй, наколькі тэхналагічны працэс гэтага прадукту бесперапынна.

Але ці толькі ў гэтым справа?

Народны камісар харчовай прамысловасці БССР т. Пацовіч сам прызнае, што нельга толькі гэтымі прычынамі растлумачыць дрэнную работу прадпрыемстваў. Галоўныя прычыны трэба шукаць у адсутнасці канкрэтнага аператыўнага кіраўніцтва вытворчасцю, у недастатковай барацьбе за выяўленне і выкарыстанне ўнутраных рэсурсаў. Работнікі заводаў, трэстаў і наркамата не праявілі дастатковай настойлівасці ў забеспячэнні прадпрыемстваў сыравінай і палівам, у ліквідацыі вытворчых непаладкаў і вялікіх страт.

Кандытарская прамысловасць (дырэктар трэста «Белкандытар» т. Прусакоў) за першае паўгоддзе страціла звыш планоўленых норм 360,3 тоны сухога рэчыва. Інакш кажучы, былі страчаны 361 тон дэфіцытнай сыравіны—цукру і патакі. Гэтыя страты абышліся дзяржаўным звыш 1 мільёна рублёў. Толькі за кошт прадукцыйных страт недадана спажыўцу звыш 500 тон кандытарскіх вырабаў. Адна з вялікая кандытарская фабрыка «Чырвоны мазыранін» (дырэктар т. Дынаў) за паўгоддзе марна страціла 7,6 проц. сыравіны колькасці сыравіны.

Няма чаго даказваць вялікае значэнне для народнай гаспадаркі маслабойнай прамысловасці. Абавязак кіраўнікоў заводаў выканаць з ільносемя прэдзельна магчымую колькасць расліннага масла. Аднак за нарушэнняў тэхналагічнага працэса, розных вытворчых непаладкаў дапускаюцца вялікія страты масла. Віцебскі маслабойны завод (дырэктар т. Багрынскі) за 9 месяцаў пакінуў у макусе 3 тон расліннага масла.

Барысаўская макаронная фабрыка імя Леніна (дырэктар т. Азаронак) замест планага расходвання 1.027 кг. мукі на 1 т макаронных вырабаў расходавала па 1.135 кг. Фабрыка, такім чынам, страціла 46 тон мукі.

Што-ж атрымліваецца? Дырэктары фабрык скардзяцца на недастачу сыравіны, а ў з-за гэтага вытворчай праграмы і ў тым жа час, у выніку іх безгаспадарчасці, марнаваецца і псуецца велізарная маса каштоўнай сыравіны.

Такая-ж карціна з расходваннем паліва. Адома, што рад прадпрыемстваў меў вялікія прастоі з-за недастачы паліва, але ці не прымусіла іх кіраўнікоў беражна абходзіць яго. Некаторыя гаспадарнікі дасягнулі велізарныя перапалы.

Перарасходванне паліва на гомельскім кандытарскім камбінаце «Спартак» (дырэктар т. Кірзнер) дасягнула за 8 месяцаў бягучага года нечуваных размераў. 1.300 проц. паліва — 48,4 проц. планавай патрэбнасці камбіната ў паліве — перапела ў трубу. Мінскі дражджавы завод «Чырвоная зара» (дырэктар т. Серы) перарасходваў за поўгода 543 тоны паліва, або 29.3 проц. планавай патрэбнасці прадпрыемства.

У святле гэтых лічбаў вельмі непераканаўчымі выглядаюць спасылкі кіраўнікоў прадпрыемстваў на недастачу паліва.

Партыя і ўрад патрабуюць ад работнікаў гэтай галіны прамысловасці, каб іх прадукцыя, якая спажываецца самымі шырокімі масамі насельніцтва, была бездакорнай па якасці, адпавядала задавальняла запросы спажыўца. Для Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 ліпеня якасць харчовых прадуктаў у паўнай ступені палепшылася.

Але ўсё-ж яшчэ нярэдкі факты выпуску прадукцыі нізкай якасці, ігнараравання інтарэсаў спажыўца.

На абыўшайся нядаўна нарадзе актыва Наркамата харчовай прамысловасці прыводзілася многа фактаў бракаробства на прадпрыемствах. У Гомелі ў гандлюючую сетку быў адпраўлен дрэнна выпечаны, сыры хлеб. Не так даўно ў Віцебску пякарня № 2 выпусціла 1.200 кілограмаў французскіх булак, зусім нягодных для спажывання. На мінскай кандытарскай фабрыцы «Комунарка» ў верасні былі забракаваны 10,6 тоны карамелі. На гомельскім камбінаце «Спартак» былі забракаваны 4,2 тоны папсаванага бісквіта, выпечанага з нарушэннем тэхналагічных правіл.

А колькі ёсць фактаў нарушэння рэцэптуры, незахавання тэхналагічнага працэса! Усё гэта — вынік таго, што кіруючыя работнікі прадпрыемстваў, трэстаў і наркамата не навучыліся яшчэ паважаць інтарэсы спажыўца, сур'ёзна, па-большэвіцку змагацца за якасць прадукцыі.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня даў гаспадарчым работнікам магутны сродак барацьбы за ўстанаўленне жалезнай працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах, за ўзорную арганізацыю вытворчасці. Аднак на прадпрыемствах харчовай прамысловасці фармальна падышлі да рэалізацыі Указа. Больш таго, некаторыя дырэктары хлебазаводаў і пякарань сталі на злачынны шлях сабатыравання Указа. Хлебапякарныя прадпрыемствы Мінска, Гомеля, Магілева перайшлі на новы графік работы са спазненнем на 15 дзён, а гарадоцкая пякарня — толькі 16 ліпеня.

На многіх прадпрыемствах шчодрыя дырэктары направа і налева раздаравалі рабочым і служачым так званыя «вопускі за свой кошт». Трэба з'ездзіць да радных, купіць парасё, пагуляць на вяселлі — калі ласка, атрымай вопуск. Вопускі давалі і брыгадзіры, і начальнікі цэхаў. Яны нават не афармляліся загадамі. Мінскі абласны трэст хлебапячэння (дырэктар т. Штэйнгольц) доўгі час займаў пазіцыю пабочнага наглядальніка.

Усе пералічаныя недахопы не маглі не адбіцца на рабоце прамысловасці. У прыватнасці, гэта прывяло да павышэння сабекошту прадукцыі. Кандытарская прамысловасць за 8 месяцаў павялічыла сабекошт прадукцыі супроць плана на 1.424 тыс. руб Сабекошт прадукцыі дражджавых заводаў павялічыўся на 1.831 тыс. руб.

Некалькі слоў аб кіраўніцтве прамысловасцю з боку наркамата і трэстаў. Наркамат за апошні час многага дабіўся ў адносінах выканання Указаў ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня. Сабатажнікі Указа зняты з работы і аддадны пад суд. Але наркамат яшчэ не навучыўся чотка, аператыўна і канкрэтна кіраваць прадпрыемствамі.

У Беларусі ёсць невычарпальныя крыніцы сыравіны для харчовай прамысловасці: дзікарастучыя ягады, плады, грыбы, мёд, хмель, ільняное семя. Важнейшае значэнне маюць загатоўкі бульбы для крухмальных і спіртаводачных заводаў. Што зроблена для таго, каб разгарнуць загатоўкі, арганізаваць бесперабойную прыёмку прадукцыі па пунктах і заводах, забяспечыць захаванне загатоўленай бульбы? Вельмі мала. Гэта адзін з самых адстаючых участкаў работы.

На бабруйскай кандытарскай фабрыцы «Чырвоны харчавік» ёсць адзіны ў БССР цэх, які выпрацоўвае халву. Ён зараз не працуе, яшчэ ў маі месяцы яго закрылі з-за адсутнасці элементарных тэхнічна-санітарных умоў для работы. Што зроблена наркаматам, каб адрамантаваць цэх, аднавіць яго? Нічога. Такая-ж карціна ў Слуцку. У хлебапякарні печы развалены, будынак лезь трымаецца, а рамонт яго не робіцца. У наркамаце не цікавяцца лёсам маленькіх прадпрыемстваў, не клапоцяцца аб іх.

Харчовая прамысловасць БССР мае ўсе ўмовы для паляпшэння работы, для выкапання і перавыканання плана. Уся справа—у чоткім, аператыўным кіраўніцтве, у навядзенні большэвіцкага парадку на прадпрыемствах, у рашучым знішчэнні расхлябанасці і непрадукцыйных страт, у строгім захаванні тэхналагічнай дысцыпліны, у няўхільным выкананні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня.

С. БУТОМАЎ,
С. ДНЯПРОЎСКІ.



Калгас «Перамога» (Талачынскі раён, Віцебскай вобласці) залічан кандыдатам на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку 1941 года. У гэтым годзе калгас дабіўся ўраджаю — ячменю 30 цнт., пшаницы 21 цнт., аўса 19 цнт., жыта 14 цнт. і бульбы 200 цнт. з гектара. На здымку: брыгадзір А. К. Кудзін (злева) і старшыня калгаса ордэнаносец С. Н. Грыгаровіч за адборам экспанатаў аўса і жыта для адпраўкі на выстаўку.
Фото І. Шышко. (Фотахроніка БЕЛТА).

АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАВІЛЬНАЕ ХАВАННЕ БУЛЬБЫ

Сёлета калгасы Беларусі атрымалі багаты ўраджай бульбы. Уборка і буртаванне яе праведзены пераважна ў сырое і дажджлівае падвор'е. У многіх мясцах забуртаваны неперабраныя, у значнай ступені паражоныя фітафторай клубняі. Гэта абавязвае ў далейшым звярнуць усю ўвагу на захаванне бульбы, асабліва ў буртах насенных і страхавых фондаў.

У калгасах трэба зараз-жа выдзеліць людзей адказных за захаванне бульбы. Догляд за ёю ў асноўным павінен заключацца ў вымяранні тэмпературы ў буртах, вентыляцыі — праветрыванні.

Першыя два тыдні пасля закладкі свежаўбранай бульбы тэмпература ў буртах утрымліваецца на ўзроўні 10—15 градусаў цяпла. Такая тэмпература спрыяе больш быстраму залечванню раненняў і зацвярдзенню кажуры клубняў. Пасля 15 дзён тэмпературу ў буртах трэба знізіць да 4 градусаў, а потым паступова да 2—3 градусаў цяпла.

Тэмпература бульбы вымяраецца шляхам апускання тэрмометра ў вентыляцыйныя трубы або ў спецыяльна праробленыя адтуліны як па грэбені, так і з бакоў бурта.

Вентыляцыя буртоў праводзіцца шляхам адкрыцця гарызантальных і вертыкальных труб або шляхам пакідання грэбеняў не засыпанымі зямлёй да наступлення маразоў. У выпадку неабходнасці можна на зіму зрабіць адтуліны і зверху, прычым іх трэба прыкрыць саломай, або ўставіць трубы даўжынёй 60—80 сантыметраў. Месца вакол труб старанна ўкрываецца саломай, каб пазбегнуць падцёку вады. З наступленнем маразоў трубы забіваюцца саломай і зверху пакрываюцца гноем.

Моцнае ўвільгатненне клубеняў на версе гребеня сведчыць аб высокай тэмпературы ў бурце. Навышэнне-ж тэмпературы да 80 і больш градусаў азначае загніванне бульбы. Такі бурт неабходна праветрываць і зімой, адкрываючы вентыляцыйныя трубы, або прабіваючы адтуліны на грэбені. Калі-ж, не гледзячы на праветрыванне, тэмпература будзе павялічвацца, бурт трэба раскрыць і вывезці бульбу.

Паўторная абсушка буртоў праводзіцца толькі з наступленнем пастаянных маразоў. Агульная таўшчыня пакрыўкі павінна быць: не менш 50 см. саломы плюс 50 см. зямлі. Ля асновы бурта яна робіцца таўсцей на 20—30 сантыметраў.

В. МІГУЦКІ,
навуковы супрацоўнік Белдзяржселекцыйнай станцыі.

ЗДАЮЦЬ ІЛЬНОВАЛАКНО ДЗЯРЖАВЕ

ЕЛЬСК. (Кар. «Звязды»). Калгас «Чырвоны араты», Асінцаўскага сельсовета, арганізавана прыступіў да пярвічнай апрацоўкі тэхнічных культур. Працуюць у дзве змены. Калгаснікі Марыя Козел, Малання Козел, Усціна Серая штодзённа даюць па тры нормы. Калгас здаў на загатоўчы пункт 90 кілограмаў ільновалакна.

Добрымі поспехамі сустракаюць вялікае свята калгаснікі сельгасарцелі «Серп і молат», Кармянскага сельсовета. Калгас закончыў палявыя работы і паспяхова праводзіць апрацоўку і здачу тэхнічных культур дзяржаве. Ужо здана 280 кілограмаў пянькі і 300 кілограмаў ільновалакна. Калгаснікі абавязаліся да 1 лістапада закончыць апрацоўку тэхнічных культур і поўнасцю разлічыцца з дзяржавай.

***

Перадавыя калгасы раёна пачалі масавую апрацоўку ільну і здачу дзяржаве ільнопрадукцыі. Калгас імені Молатава ўжо здаў дзяржаве 400 кілограмаў добраякаснага ільновалакна.

Арганізавана праходзіць апрацоўка ільну і здача ільновалакна дзяржаве ў калгасе імені Энгельса. 500 тон ільновалакна здаў дзяржаве калгас «III рашаючы».

Прыступілі да апрацоўкі ільну і здачы ільнопрадукцыі дзяржаве таксама калгасы імені Калініна і імені Будзённага.

(БЕЛТА).

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ПАЧАЛАСЯ БАЯВАЯ ВУЧОБА

Кожны дзень у воінскія часці прыбывае маладое папаўненне прызыва 1940 года. У большасці сваёй новыя чырвонаармейцы маюць сярэднюю, вышэйшую і ніжэйшую асвету, у кожнага з іх па тры-чатыры абаронныя значкі. Многія аўладалі воінскімі спецыяльнасцямі: сталі снайперамі, вадзіцелямі машын, тэхнікамі, трактарыстамі. Нядаўна прыбылі новыя байцы ў падраздзяленне старшага лейтэнанта ордэнаносца тав. Бахончука. На грудзях у маладых воінаў Чырвонай Арміі тт. Фрыдмана, Шароўскага, Далінскага, Саснова, Белага па чатыры абаронныя значкі.

Маладыя воіны праходзяць страявую падрыхтоўку, вывучаюць Статуты і настаўленні, дзеючыя ў Чырвонай Арміі.

Малодшы лейтэнант тав. Каралёў правёў з імі заняткі па падрыўной справе; ён ім расказаў, як пабудавана запальваючая трубка, бікфордаў шнур, як робіцца ўзрыў, затым байцы самі на практыцы зрабілі падрыў велізарнай сасны.

Намеснік камандзіра па палітычнай часці тав. Фількін расказаў маладым байцам аб гераічных традыцыях часці, узнагароджанай ордэнам Леніна, аб Героі Савецкага Саюза тав. Карозіне і чырвонаармейцу ордэнаносцу тав. Пасашкове. Тав. Фількін раз'ясніў Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і загады Наркома Абароны, азнаёміў байцоў з міжнародным становішчам.

У клубе падраздзялення заўсёды поўна. Маладыя воіны іграюць у шашкі, шахматы, даміно. Басц Шароўскі арганізаваў драматычны гурток. Кожны вечар дэманстрыруецца кінофільм. Байцы праглядзелі ўжо фільмы «Вогненныя гады», «Вялікае зарава», «Мы з Кранштата», «Мае універсітэты», «Будні» і іншыя.

І. С. ЧЭПІК,
намеснік палітрука.

МЫ АСТАЕМСЯ БАЙЦАМІ

Чырвонаармейцы і малодшыя камандзіры, выслужыўшыя ўстаноўлены тэрмін сапраўднай ваеннай службы, зараз звальняюцца ў бестэрміновы вопуск. Яны едуць дадому з пачуццём найвялікшай удзячнасці Чырвонай Арміі за баявую выручку і палітычнае выхаванне.

Чырвоная Армія з'яўляецца выдатнай жыццёвай школай, школай вынослівасці, мужнасці, адвагі. Гэтыя якасці, уласцівыя патрыётам социялістычнай радзімы, былі ярка прадэманстраваны ў вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь, у барацьбе з фінскай белагвардзейшчынай, усюды, дзе навісала пагроза недатыкальнасці совецкіх граніц.

Удзельнік баёў пад горадам Гродна ў часе вызваленчага паходу чырвонаармеец тав. Ножнікаў, уходзячы ў бестэрміновы вопуск, заяўляе: «Вызваленчы паход у Заходнюю Беларусь для мяне астанецца памятным назаўсёды, як самая вялікая падзея ў маім жыцці. Гэтыя дні былі для мяне днямі вялікай загартаванасці, выпрабавання маіх ведаў і сіл».

— Уходзячы ў доўгатэрміновы вопуск, — гаворыць тав. Макараў, — я з удзячнасцю буду успамінаць Чырвоную Армію, якая выхавала мяне, дала вялікі жыццёвы вопыт.

Тав. Макараў на працягу ўсёй сваёй службы ў Чырвонай Арміі з'яўляўся выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі. У арміі ён прынят у члены РКП(б). Працаваў намеснікам палітрука, скончыў школу партыйнага актыва, перад звальненнем у доўгатэрміновы вопуск ён здаў іспыты на малодшага палітрука запаса.

Ад радавога байца да палітработніка—такі шлях двухгадовай службы тав. Макарава ў радах РСЧА.

Цёпла, па-прыяцельску развітваючыся з астаючымися таварышамі, адпускнікі вяртаюцца да мірнай творчай працы з поўным усведамленнем свяшчэннага абавязку грамадзяніна.

— Уходзячы дамоў, — гаворыць малодшы камандзір Цепюркін,—мы астаемся байцамі Чырвонай Арміі, мы разумеем напружанасць міжнароднага становішча. Калі нас зноў радзіма закліча да зброі, мы ўсе, як адзін, з чэсцю выканаем свой абавязак.

Палітрук Я. ІВАШЫН.

НА АГНЯВЫМ РУБЯЖЫ

На агнявым рубяжы—кандыдаты партыі лейтэнант тав. Лагойскі і малодшы лейтэнант тав. Рамашкін. Прыклады вінтовак моцна прыціснуты к плячам. Кожны ўзгорак зямлі, кожны кусцік не ўскальзае ад вопытнага назіральнага вока камандзіраў.

Раптам уперадзе, на дыстанцыі ў 200 метраў ад стралкоў, паявіліся дзве зеленаватыя мішэні, ізабражаючыя сілуэты назіральнікаў праціўніка.

З такой-жа быстрынёй мішэні скрыліся пасля ружэйных выстралаў. З блінджа па тэлефону паведамілі:

— Першая — тры прабоіны, другая—таксама тры прабоіны. Рэзультат выдатны.

Камандзіраў змянілі іх падначаленыя — чырвонаармейцы Власаў і Махаеў. Другое практыкаванне пачатковай стральбы з вінтоўкі яны выканалі на выдатна.

Усяго страляла 17 чалавек. 6 чалавек выканалі практыкаванне выдатна, пяць—добра і шэсць — здавальняюча.

Падраздзяленне, якім камандуе лейтэнант тав. Лагойскі, атрымала ад камандавання выдатную ацэнку. Камандзір часці аб'явіў падзяку ўсяму асабоваму саставу падраздзялення.

С. МАРОЗАЎ.

МІТЫНГ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І СЯЛЯН

Доўга чакалі жыхары вёскі гэтага радаснага дня. На іх долю выпала шчасце ўпершыню праводзіць сваіх лепшых сыноў і землякоў у родную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію. Апранутыя пасвяточнаму, сяляне ўсе ад малога да старога прышлі прыняць удзел у провадах. Пад гукі гармонікаў, з радаснымі спевамі пакіраваліся жыхары вёскі да адправачнага пункта.

Па дарозе яны сустрэлі байцоў і камандзіраў П-скай часці, якія вярталіся дамоў з тактычных вучэнняў. Адбыўся мітынг.

Ад імені чырвонаармейцаў з прывітальнай прамовай выступіў баец-выдатнік т. Крашэннікаў. Ён сказаў:

— Прапоўныя заходніх абласцей БССР упершыню праводзяць сваіх сыноў у Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію. Сённешняя радасць і лікаванне прапоўных сведчыць аб выключнай адданасці пашага народа партыі і ўраду, аб яго любві да Чырвонай Арміі.

Мы, чырвоныя воіны, добра адчуваем любоў свайго народа, яго клопаты аб нас. І адказваем на гэта бесперапынным узмацненнем абаронай магутнасці сваёй радзімы.

У заключэнне т. Крашэннікаў заявіў, што Чырвоная Армія з радасцю чакае новых байцоў, палкіх патрыётаў краіны социялізма. Ад імені працоўных вёскі з прамовай выступіў селянін Сеўчук.

— Сёння, сказаў т. Сеўчук, — мы праводзім у рады РСЧА сваіх землякоў-прызыўнікоў. Але, калі гэта спатрэбіцца, кожны з нас стане на абарону крэпасці социялізма, увальецца ў рады Чырвонай Арміі, якая назаўсёды вызваліла нас ад гнёту памешчыкаў і капіталістаў.

А. ФРАЙМАН.

Нікалай Бауман

(Да 35-годдзя з дня смерці—31-X)

Чалавек ленінскага пакалення, адзін з лепшых саратнікаў Леніна і Сталіна на першым этапе будаўніцтва большэвіцкай партыі, Нікалай Эрнеставіч Бауман нарадзіўся 29 мая 1873 года ў сям'і абойнага майстра. Падрастаў Нікалай Бауман у эпоху быстрага развіцця капіталізма ў Расіі, калі «рабочы клас станавіўся магутнай перадавой сілай, здольнай да арганізаванай рэвалюцыйнай барацьбы» («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 12). У перыяд лепшая частка інтэлігенцыі звязвала свой лёс з лёсам змагаючагося рабочага класа. З раннята юнацтва прадаецца ў гэту барацьбу і Нікалай Бауман.

У рэвалюцыйнай барацьбе я тады ўжо, з юнацтве, бачыў сэнс ўсяго свайго жыцця — гаварыў пазней Бауман таварышам, успамінаючы сваё юнацтва.

Першыя-ж крокі на шляху рэвалюцыйнай барацьбы прыводзяць Баумана да канфлікта з бацькоўскім домам, дзе панавалі патрыярхальныя нравы мяшчанскай сям'і. У далейшым гэты канфлікт да таго ступені абвастрыўся, што юнаку прыйшлося ўйсці з дому і жыць упрогалодзь, займаючыся прыватнымі ўрокамі.

Гімназіцыгаловы Бауман пачынае вывучаць самастойным жыццём, многа працуе сам сабою, вывучаючы па ўсіх даступных крыніцах марксізм.

Прыблизна пачасова Бауман з групай таварышаў такіх-жа энтузіястаў завязвае ў Казані сувязі з рабочымі фабрыкі Крастоў, сярод якіх ён вядзе прапаганду.

У 1891 годзе Бауману ўдаецца паступіць у Казанскі ветэрынарны інстытут. Займаючыся ў інстытуце, ён нястомна працаўжае прапагандысцкую работу сярод рабочых Казані, падтрымлівае моцную сувязь з рэвалюцыйным студэнцтвам.

Восенню 1895 года Бауман, закончыўшы інстытут, атрымлівае дыплом ветэрынарнага ўрача. З гэтага часу ён чалавек пэўнай прафесіі але сапраўдная яго прафесія — рэвалюцыйная работа. Каб яшчэ лепш да яе падрыхтавацца ён едзе ў Петербург, дзе В. І. Леніным ужо створан «Петербургскі Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа».



Асабіста сустрэцца з В. І Леніным Бауману ў гэты перыяд не давялося. В. І. Ленін, як вядома, у снежні 1895 года быў арыштаван і затым саслан у Сібір. Але ленінскую славутую кнігу «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваюць супроць социял-дэмакратаў?» Бауман мог ужо чытаць і ў сваёй рабоце кіравацца ленінскімі ўстаноўкамі.

На працягу раду месяцаў 1896 года Бауман, з'яўляючыся актыўным членам петербургскага «Саюза барацьбы», увесь паглынут прапагандысцкай работай сярод петербургскіх тэкстыльных рабочых. Летам таго-ж года пад кіраўніцтвам «Саюза барацьбы» адбываецца вядомая забастоўка 30 тысяч тэкстыльшчыкаў.

У сакавіку 1897 года царскія жандары арыштоўваюць Баумана. У адзіночны Петрапаўлаўскай крэпасці ён праводзіць звыш 19 месяцаў. У снежні 1898 года яго высылаюць на 4 годы ў Вяцкую губерню.

У ссылцы Бауман узмоцнена працуе над сабой. Тут ён сустракаецца з ссыльнымі марксістамі, чытае марксісцкую і нелегальную літаратуру.

Калі ў вяцкую ссылку папаў напісаны Леніным вядомы пратэст 17 палітычных ссыльных-марксістаў супроць выступчанага «эканамістамі» у 1899 годзе «маніфеста», патрабаваўшага адмаўлення ад стварэння самастойнай партыі пролетарыята, ад самастойных палітычных патрабаванняў пролетарыята, Нікалай Бауман з поўнай гатоўнасцю дае свой подпіс пад ленінскі дакумент Гэты пратэст «меў велізарнае значэнне ў справе развіцця марксісцкай мысліі і марксісцкай партыі ў Расіі» («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 24).

Праз год Бауман, пасля пабегу з ссылкі, асабіста сустракаецца з В. І. Леніным Гэта было летам 1900 года ў Швейцарыі. Сюды В. І. Ленін прыехаў для арганізацыі «Искры». Аб ролі Баумана ў арганізацыі «Искры» Ленін пісаў, што ён «удзельнічаў у 1900 годзе з самага пачатку ў арганізацыі «Искры», будучы адным з галоўных практычных кіраўнікоў справы» (Ленін, т. VIII, стар. 358). У канцы 1901 года В. І. Ленін накіроўвае Баумана на нелегальную работу ў Маскву, а таксама даручае яму аб'ехаць рад гарадоў для інструктажу мясцовых арганізацый. У Маскве за Бауманам пачынаецца слежка філераў ахранніка Зубатава. Бауман прабуе скрыцца, уязджае з Масквы ў напрамку да Кіева, дзе павінна была адбывацца нарада іскраўцаў, але на адной з станцый яго арыштоўваюць і адпраўляюць у кіеўскую Лук'янаўскую турму. Сюды былі дастаўлены і другія іскраўцы, над якімі царскі жандар генерал Навіцкі меркаваў наладзіць працэс.

Аднак бравага генерала пасцігла няўдача: у адзін цёмны жнівеньскі вечар 1902 года «злачынцы» ў колькасці 11 чалавек уцяклі з турмы. Нікалай Бауман з'явіўся галоўным натхніцелем, арганізатарам і ўдзельнікам гэтага смелага пабегу. Апёкшы за граніцу, Бауман, радасна сустрэты В. І. Леніным, прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы II з'езда РСДРП, на якім удзельнічае ў якасці дэлегата ад маскоўскай партарганізацыі пад іменем Сарокіна.

Бауман прадстаўляе з'езду абшырны даклад аб стане маскоўскай партарганізацыі. На з'ездзе ён нязменна з В. І. Леніным. Пасля адбыўшагася на з'ездзе раскола ён прымае самы гарачы ўдзел у барацьбе з меншавікамі.

Аўтару гэтых радкоў давялося ў тыя далёкія годы — глыбокай восенню 1903 года — быць сярод невялікай групы большэвікоў, акружаўшых у Жэневе В. І. Леніна Меншавікі, іранізіруючы, называлі гэту групу цвёрдакаменнымі. Самым цвёрдакаменным з нас быў Нікалай Бауман, яго меншавікі асабліва ненавідзелі, чуючы ў ім небяспечнага праціўніка. Бауман быў ім сапраўды небяспечны сваёй гарачай верай у таржаство справы Леніна, сваёй невычарпальнай энергіяй у барацьбе з імі, сваёй жыццерадаснасцю, уменнем групіраваць вакол сябе старонікаў большэвікоў.

У канцы 1903 года Бауман па даручэнню В. І. Леніна зноў адпраўляецца ў Маскву. Побач з умацаваннем маскоўскай партарганізацыі, расшырэннем яе сувязей з рабочымі фабрык і заводаў, арганізацыяй тайнай друкарні для друкавання большэвіцкіх лістовак ён занят стварэннем большэвіцкага цэнтра — Паўночнага Бюро ЦК. На Каўказе таварыш Сталін разгарнуў у гэты час барацьбу за III з'езд партыі. Паўночнае Бюро ЦК павінна было стаць цэнтрам такой-жа барацьбы ў Маскве, Петербургу і ўсёй прамысловай абласці поўначы Расіі.

У чэрвені 1904 года Бауман зноў у турме — у трэці раз. Сядзіць ён у маскоўскай «Таганцы».

Нікалай Бауман, які ніколі не сумаваў і ў больш цяжкія часы, цяпер, калі ў дверы ўжо стукаўся баявы 1905 год, у турме заражаў усіх сваім кіпучым рэвалюцыйным тэмпераментам. Больш года праводзіць ён у турме. 21 кастрычніка 1905 года, за 10 дзён да таго, як ён паў на слаўным сваім баявым пасту, Бауман быў выпушчан з турмы пад залог 300 рублёў «да суда». За гэты год, што быў ён адарван ад практычнай рэвалюцыйнай работы, у жыцці царскай Расіі адбыліся велізарныя зрухі. Бауман вышаў з турмы ў момант, калі ў краіне пачалася ўсеагульная палітычная стачка, якая прымусіла да смерці перапалоханага пара выпусціць «маніфест» аб «свабодах».

Царскім абяцанням «свабод» ніхто не верыў У народзе голасна расцвялі:

«Царь испугался, издал манифест:
Мертвым — свобода, живых — под арест».

Бауман акунуўся ў рэвалюцыйную работу, увесь час праводзіў у маскоўскім большэвіцкім камітэце партыі, які кіраваў усеагульнай забастоўкай, усёй рэвалюцыйнай барацьбой у Маскве і абласці.

31 кастрычніка — на наступны дзень пасля выдання царскага «маніфеста» — у інтэрнаце студэнтаў Вышэйшага тэхнічнага вучылішча адбывалася нелегальнае пасяджэнне МК з удзелам Баумана. Рашана было арганізаваць масавую дэманстрацыю да турмаў для вызвалення палітычных зняволеных.

У аўдыторыях вучылішча ў гэты час з раніцы да позняй ночы адбываліся масавыя мітынгі. Калі ў аўдыторыях даведаліся аб рашэнні МК, увесь народ высыпаў на вуліцу. Узвіліся сцягі. Уперадзе народа быў Нікалай Бауман.

Заўважыўшы каля бліжэйшай фабрыкі (быўшай Шчапава) групу рабочых, Бауман рашае і іх далучыць да дэманстрацыі. Ён бярэ з рук аднаго з дэманстрантаў чырвоны сцяг, ускаквае на рамізнікую пралётку, каб быстрэй дабрацца да фабрыкі. І раптам палае, сражоны насмерць ударам у галаву. Гэта злачынскае забойства зрабіў чорнасоценны ахранник.

Велізарнае абурэнне выклікала сярод працоўных Масквы забойства тав. Баумана. Сотні тысяч людзей удзельнічалі ў пахаванні гэтага выдатнага большэвіка, які беззаветна змагаўся за вялікую справу вызвалення рабочага класа.

В. І. Ленін у некролагу, прысвечаным Бауману, пісаў: «Вечная памяць рэвалюцыянеру, паўшаму ў першыя дні пабеднаснай рэвалюцыі! Няхай пасцлужаць ушанаванні, аказаныя паўстаўшым народам яго праху, залогам поўнай перамогі паўстання і поўнага знішчэння праклятага парызма!».

Совецкі народ ніколі не забудзе свайго вернага і адданага сына Н. Э. Баумана, загінуўшага на рэвалюцыйным пасту.

Ц. ЗЕЛІКСОН-БАБРОЎСКАЯ.

За рубяжом

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 29 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе, што ўчора паспяховай бамбардыроўцы падвергліся важныя ў ваенных адносінах заводы паблізу Бруклэндс, Стэндон, Клактон-Он-Сі і Эшфорд. У Паўднёвай Англіі бомбы скінуты на воінскія лагеры.

Ноччу жорсткай бамбардыроўцы падвергліся Лондан, дзе пачалося многа пажараў, прамысловыя пабудовы Бірмінгама, Кавентры, порт Ліверпуля і некаторыя аэрадромы.

Атака непрыяцельскіх самалётаў-тарпеданосцаў была паспяхова адбіта меткім агнём вартавых суднаў.

Налёты непрыяцельскіх самалётаў на Германію былі мала эфектыўны. У некаторых пунктах бамбардыроўцы падвергліся жылыя кварталы. Пашкоджаны дамы. Сярод насельніцтва ёсць забітыя і раненыя. У адным з гарадоў Паўночнай Германіі бомбы папалі ў капцельнае памяшканне завода, не нанёсшы значных пашкоджанняў.

Учора непрыяцель страціў 10 самалётаў, германская авіяцыя — 8.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 29 кастрычніка. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ў ноч на 29 кастрычніка галоўны ўдар германскай авіяцыі быў зноў накіраван супроць Лондана і гарадоў цэнтральнай часткі Англіі. У раёне Лондана страты нанесены магазінам, жылым і інш. будынкам.

У некаторых гарадах Цэнтральнай Англіі, у выніку бамбардыровак, успыхнулі пажары, якія былі быстра ліквідаваны або лакалізаваны. Налічваецца некалькі забітых.

Матэрыяльныя страты і лік афяр у паўднёва-ўсходняй і паўночна-ўсходняй Англіі нязначныя.

У ноч на 29 кастрычніка англійская авіяцыя паспяхова бамбардыравала ваенныя аб'екты ў Германіі, а таксама на акупіраванай немцамі тэрыторыі. Многа бомб скінута на парты і аэрадромы.

Па афіцыяльных даных, за тыдзень, які скончыўся 26 кастрычніка, у часе налётаў на Англію германская авіяцыя страціла 39 самалётаў, англійская—18.

Сканчэнне перагавораў Гітлера з Мусаліні

РЫМ, 28 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Стэфані перадае, што пасля гутаркі паміж Гітлерам і Мусаліні было апублікавана наступнае паведамленне:

«Мусаліні і Гітлер гутарылі сёння некалькі гадзін. Гутарка, адлюстроўваўшая саюз паміж абодвума дзяржавамі, мела, як заўсёды, самы сардэчны характар і выявіла поўнае адзінства поглядаў па ўсіх актуальных пытаннях. У перагаворах прымалі ўдзел італьянскі міністр замежных спраў Чыяно і германскі міністр замежных спраў Рыбентроп».

Ваенныя дзеянні паміж Італіяй і Грэцыяй

НЬЮ-ЙОРК, 29 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, 28 кастрычніка ў Афінах афіцыяльна паведамлялася, што на працягу дня італьянскія часці прадаўжалі атакі на грэчаскія войскі, якія стойка абараняюць свае пазіцыі. Ваенныя дзеянні лакалізаваны ў пагранічных раёнах. Італьянскія самалёты зрабілі безрэзультатныя налёты на ваенныя аб'екты.

Грэчаскі кароль прыняў на сябе вярхоўнае камандаванне ўзброенымі сіламі Грэцыі. Начальнік генеральнага штаба генерал Папагос назначан галоўнакамандуючым сухапутнымі сіламі.

Урад забараніў друку публікаваць паведамленні з Рыма і Берліна. Грэчаскі пасланнік у Рыме адкліканы.

Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Каіра, пражываючыя ў Егіпце грэкі фарміруюць армію ў 20 тысяч чалавек.

Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, канадскі прэм'ер Кінг заявіў, што краіны, уваходзячыя ў састаў Брытанскай імперыі, «ахвотна зробяць усё, што ў іх сілах, каб дапамагчы Грэцыі».

НЬЮ-ЙОРК, 29 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, учора 15 грэчаскіх самалётаў і зенітная артылерыя адагналі італьянскія самалёты, напаўшыя на галоўныя транспартныя пэнтры Грэцыі, уключаючы афінскі аэрадром і порт Патры (Патрас).

НЬЮ-ЙОРК, 29 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Інтэрней-шэнель Ньюс Сервіс з Будапешта, у зводцы, апублікаванай грэчаскім генеральным штабам, гаворыцца, што зараз на тэрыторыі Грэцыі няма італьянскіх войск. У афіцыяльных грэчаскіх кругах заяўляюць, што збіта 17 італьянскіх самалётаў.

Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, у апублікаванай грэчаскай зводцы гаворыцца, што грэчаская авіяцыя бамбардыравала без страт для сябе ваенныя аб'екты праціўніка.

АФІНЫ, 29 кастрычніка. (ТАСС). Італьянскія войскі пачалі наступленне па ўсёй грэка-албанскай граніцы. Італьянская авіяцыя бамбардыравала Карыпф, Патры (Патрас), Элеўсін і Татой. У Патрах 4 чалавекі забіты і 17 ранена.

АФІНЫ, 29 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне грэчаскімі ўзброенымі сіламі паведамляе: «Па працягу 28 кастрычніка італьянскія часці прадаўжалі атакаваць нашы войскі, якія аказалі жорсткае супраціўленне. Ваенныя дзеянні лакалізаваны на пагранічнай лініі.

Авіяцыя праціўніка зрабіла напад на некаторыя ваенныя аб'екты, не нанёсшы ім страты».

Становішча ў Грэцыі

АФІНЫ, 29 кастрычніка. (ТАСС). Афіны зацемнены. Прыняты меры на выпадак налёту авіяцыі праціўніка. Многа жыхароў Афін пакідае горад.

Друк паведамляе, што рашэннем урада ўся Грэцыя аб'яўлена на ваенным становішчы. Марское міністэрства аб'явіла мабілізацыю прызыўных 1940 г. Запасныя прызыва 1930—1934 гг., якія пражываюць у абласцях: Аціці, Біоціі, Капісці, Эўбеі павінны з'явіцца ў свае часці. Прызваны таксама рабочыя марскіх крэпасцей. Міністэрства ізяржаўнай безапаснасці прызвала запасных жандармерыі прызыва 1921—1937 гг. Паліцыя прызвала запасных прызыва 1917—1937 гг. Запасныя пажарнай аховы прызваны ад 1917 па 1938 г. уключна.

Загадам урада часова вызвалены з турмаў усе зняволеныя на адзін год, за выключэннем «грамадска небяспечных». Вызвалены таксама асобы, прыгавораныя да больш доўгіх тэрмінаў зняволення; але ўжо прабыўшыя ў зняволенні год і падлягаючыя прызыву.

Грэчаскі банк выдае насельніцтву ўсяго толькі 5 проц. укладаў, але не больш 3.000 драхм.

Загадам урада ўсе школы ў Афінах і Пірэі закрыты.

Інтэрніраванне італьянцаў і немцаў у Грэцыі

НЬЮ-ЙОРК, 29 кастрычніка. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, прэм'ер-міністр Грэцыі Метаксас аб'явіў, што краіна знаходзіцца на ваенным становішчы. Урад аддаў распараджэнне аб інтэрніраванні ўсіх італьянцаў і немцаў.

Нота італьянскага ўрада Грэцыі

РЫМ, 29 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Стэфані паведамляе, што італьянскі пасланнік у Афінах Грацы ўручыў грэчаскаму ўраду 28 кастрычніка наступную ноту:

«Італьянскі ўрад быў вымушан не раз канстатываць, што на працягу сучаснай вайны грэчаскі ўрад заняў і падтрымліваў пазіцыю, якая супярэчыла не толькі нармальным мірным і добрасуседскім адносінам паміж двума краінамі, але і прамым абавязкам грэчаскага ўрада ў якасці ўрада нейтральнай дзяржавы. Італьянскі ўрад не раз быў вымушан указваць грэчаскаму ўраду на неабходнасць выканання гэтых абавязкаў і пратэставаць супроць іх сістэматычнага нарушэння. Гэтыя нарушэнні былі асабліва сур'ёзнымі, таму што грэчаскі ўрад дапускаў скарыстанне грэчаскіх тэрытарыяльных вод, узбярэжжа і партоў англійскім флотам для ваенных аперацый апошняга, садзейнічаў снабжэнню англійскіх паветраных сіл і дазволіў арганізаваць службу ваеннай інфармацыі на грэчаскім архіпелагу ў школу Італіі.

Італьянскі ўрад, гаворыцца далей у ноце мае доказ таго, што гэта супрацоўніцтва з Англіяй было пралугледжана грэчаскім урадам і рэгуліравалася пагадненнямі ваеннага і марскога характару, а таксама ў галіне авіяцыі. Італьянскі ўрад мае на ўвазе не толькі англійскія гарантыі, прынятыя Грэцыяй, якія з'яўляюцца часткай агульнай праграмы дзеянняў, накіраванай супроць безапаснасці Італіі, але таксама і ясныя і дакладныя абавязацельствы грэчаскага ўрада, якія ён узяў на сябе, каб адлаць у распараджэнне краін, ваюючых з Італіяй, важныя стратэгічныя пазіцыі на грэчаскай тэрыторыі, у тым ліку авіяпыйныя базы ў Фесаліі і ў Македоніі».

Далей у ноце падкрэсліваецца, што Італія, каб уникнуць узброенага канфлікта, рашыла прасіць грэчаскі ўрад у якасці гарантый нейтралітэта Грэцыі і безапаснасці Італіі прадаставіць італьянскім узброеным сілам права заняць некалькі стратэгічных пунктаў на тэрыторыі Грэцыі на час прадаўжэння сучаснай вайны з Англіяй, не перашкаджаць гэтай акупацыі і не перашкаджаць свабоднаму праходу войск, якія павінны яе ажыццявіць.

У заключэнне ў ноце падкрэсліваецца, што «ў выпадку калі італьянскія войскі наткнуцца на супраціўленне, гэта супраціўленне будзе зломлена зброяй, і грэчаскі ўрад будзе несці ўсю адказнасць за вынікаючыя адсюль вынікі».

Зварот англійскага караля і прэм'ера да караля і прэм'ера Грэцыі

ЛОНДАН, 29 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, англійскі кароль Георг і прэм'ер Чэрчыль звярнуліся да грэчаскага караля і прэм'ера з тэлеграмамі. Чэрчыль заяўляе, што Англія акажа Грэцыі дапамогу ўсімі сваімі сіламі.

ГРЭЦЫЯ

(Даведка)

Грэчаскае каралеўства займае паўднёвую частку Балканскага поўвострава і ўлалае ралам астравоў у Іанічаскім і Эгейскім марах. Агульная плошча краіны складае прыблізна 130 тыс. квадратных кіламетраў, лік жыхароў — 6.800 тысяч. Грэцыя мяжуе на паўночным захадзе з Албаніяй, на поўначы — з Югаславіяй і Балгарыяй, на паўночным усходзе — з Турцыяй, на захадзе, поўдні і ўсходзе яна амываецца Іанічаскім і Эгейскім марамі.

Берагавая лінія Грэцыі надзвычай зрэзана, і агульнае яе працяжэнне роўна 13.800 кіламетрам. Грэцыя ўлалае 196 буйнымі і дробнымі партамі, з якіх важнейшым з'яўляецца афінскі порт Пірэй, праз які праходзіць 45 проц. усяго марскога гандлю краіны. Галоўны горад Грэцыі — Афіны з насельніцтвам каля 400 тысяч чалавек.

Пірэй Саламін. Салонікі з'яўляюцца буйнейшымі ваенна-марскімі базамі Грэцыі. У часе сусветнай вайны грэчаскі порт Салонікі альтраў вялікую ролю ў развіцці падзей. Высадзіўшаяся ў Салоніках армія Антанты пад камандай Франшэ д'Эсперэ разбіла ў 1918 годзе балгарскую армію, а ўслед за гэтым і турэцкую.

Грэцыя знаходзіцца на перакрыжаванні важнейшых міжземнаморскіх шляхоў, і разам са сваімі астравамі яна мае першаступеннае стратэгічнае значэнне ва ўсходняй частцы Міжземнаморскага басейна. Грэцыі належаць знаходзячыяся ўзлоўж яе заходняга ўзбярэжжа Іанічаскія астравы і большая частка астравоў Эгейскага мора—Эўбея, Крыт, Самос, Хіос, Лесбос. Вострай Крыт з'яўляецца як-бы ключом да Эгейскага мора. Вялікае ваенна-стратэгічнае значэнне мае на гэтым востраве порт Суда. Грэчаскія астравы займаюць пануючую пазіцыю на шляхах да Егіпта, да Суэцкага канала, да Сірыі, Турцыі.

Вялікае ваенна-стратэгічнае значэнне мае і другі грэчаскі востраў Корфу, які знаходзіцца ля ўваходу ў Адрыятычнае мора паміж Албаніяй і паўнёвай аканечнасцю Італіі. Значэнне Корфу асабліва вырасла вясной 1939 года, пасля таго, як Італія акупіравала Албанію. Плошча вострава складае 720 кв. кіламетраў. Насельніцтва — звыш 100 тыс. чалавек. Галоўны горад вострава — Корфу — мае каля 35 тысяч жыхароў. Вострай адзелен ад Албанскага ўзбярэжжа пралівам шырынёю ўсяго ў 2½ кіламетры.

Паміж востравам Крыт і малаазіяцкім узбярэжжам Турцыі знаходзяцца італьянскія астравы Дадэканес, ператвораныя італьянцамі ў магутную ваенна-марскую і авіяцыйную базу. Асабліва вялікае значэнне мае ў гэтым архіпелагу востраў Лерос, сільна ўмацаваны італьянцамі ў апошні час. Такім чынам, па шляхах з Эгейскага мора да ўсходняй часткі Міжземнага мора размешчаны магутныя ваенна-марскія і авіяцыйныя базы Грэцыі на востраве Крыце і Італіі — на астравах Дадэканес. Моцныя італьянскія базы знаходзяцца і ля ўваходу ў Адрыятычнае мора супроць вострава Корфу — у Брынлізі, Таранто.

Да італьянскіх баз ва ўсходняй частцы Міжземнага мора трэба таксама аднесці лівійскія ваенна-марскія і авіяцыйныя апорныя пункты ў Табруку (Кірэнаіка), Трыполі (Трыпалітанія), а таксама базы на астравах Сіцылія і Пантэлерыя, размешчаныя ў самым вузкім месцы Міжземнага мора—паміж яго заходняй часткай і ўсходняй.

З англійскіх ваенных баз ва ўсходняй частцы Міжземнага мора трэба перш за ўсё адзначыць востраў Кіпр, які абараняе подступы да гарадоў Трыполі (Сірыя) і Хайфе (Палестына), дзе канчаецца нафтаправады з масульскай нафтай. Уладаючы востравам Кіпр і ваенна-марской базай у Александрыі (Егіпет), Англія абараняе подступы да Суэцкага канала. Значна далей на захадзе, паблізу Сіцыліі і Пантэлерыі, знаходзіцца другая ваенна-марская база Англіі — Мальта.

Скапленне параўнальна вялікай колькасці буйнейшых ваенна-марскіх і авіяцыйных баз Англіі і Італіі ва ўсходняй частцы Міжземнаморскага басейна яшчэ больш павышае стратэгічнае значэнне Грэцыі і яе астравоў, якія знаходзяцца ў той частцы мора, дзе праходзяць шляхі к Егіпту, Суэцу і турэцкім праліваў.

У апошнія гады Грэцыя правяла вялікія работы па ўмацаванню сваіх сухапутных граніц. Уздоўж паўночнай граніцы пабудавана так званая «лінія Метаксаса» накшталт французскай лініі Мажыно. Гэта лінія, якая складаецца з трох тысяч умацаваных пунктаў, пятнаццаці на працягу 600 кіламетраў. Умацаваныя пункты чаргуюцца з прыроднымі перашкодамі — высокімі горамі.

Карынфскі канал можа быць скарыстан Грэцыяй для перакідкі свайго флота з Эгейскага мора ў Іанічаскае і назад.



Гомельскі суднабудаўнічы завод будуе для заходняга параходства БССР 30 калёсных заходаў. На здымку: спушчаныя газаходы на экваторы завода ракі Сож.

Фото Б. Дынкіна.

НА СХОДЗЕ АБАРОННАГА АКТЫВА гор. МІНСКА

Чатыры месяцы прайшло з часу пераходу асоавіяхімаўскіх арганізацый на новае комплекснае ваеннае абучэнне насельніцтва. Пытанню аб ходзе перабудовы работы таварыства быў прысвечан праведзены 28 кастрычніка сход абароннага актыва г. Мінска. Дакладчык—старшыня Цэнтральнага совета Асоавіяхіма БССР, палкоўнік тав. Малаткоў расказаў аб першых кроках работы па-новаму ў Мінску і спыніўся па далейшых задачах абароннага актыва.

На прадпрыемствах, ва ўстановах і навучальных установах Мінска зараз налічваюцца 92 вучэбныя групы, работа якіх праводзіцца па новых камплексных праграмах. Звыш тысячы працоўных сталіцы БССР рыхтуюцца стаць поўнацэнным баявым рэзервам нашай Чырвонай Арміі. Першыя групы, якія абучаюцца па новых праграмах, падрыхтаваны ужо ў арганізацыях фабрыкі-кухні і Камісіі совецкага кантроля.

Добра разгорнута ваенная работа на радыёзаводзе. Тут рэгулярна займаецца 9 вучэбных груп. Вучоба праводзіцца практычна, з набліжэннем да ўмоў сапраўднай баявой абстаноўкі. Апрача стралковых вучэбных груп на заводзе створан гурток радыёсувязістаў, у які ўцягнуты жанчыны.

Дакладчык адзначыў, што некаторыя кіруючыя работнікі Асоавіяхіма яшчэ самі дрэнна ўяснілі сабе сутнасць перабудовы работы таварыства, у выніку чаго стварэнне вучэбных груп праходзіць выключна марудна. З 553 пярвічных арганізацый у горадзе групы па падрыхтоўцы варашылаўскіх стралкоў створаны толькі ў [illegible]. Работа гэтых груп у радзе арганізацый праходзіць яўна нездавальняюча (за[illegible] імені Мяснікова, друкарня імені Ста[illegible] і іншыя). Раённыя советы Асоавіяхіма яшчэ не сталі сапраўднымі базамі штабамі ваеннай вучобы асоавіяхімаўцаў.

Выступіўшыя ў спрэчках тт. Кастрыцкі (радыёзавод), Кавальчук (МГЭС—Рэўзін (фабрыка імені Тэльмана) і інш. перадаючы вопыт перабудовы работы падверглі крытыцы кіруючыя асоавіяхімаўскія органы за недастатковую гібкасць у кіраўніцтве пярвічнымі арганізацыямі.

Тав. Кастрынскі зусім правільна крытыкаваў райсоветы Асоавіяхіма за недастатковае забеспячэнне пярвічных арганізацый вучэбнымі дапаможнікамі і літаратурай. Для створаных вучэбных груп не неабходная колькасці экземпляраў стаття ўнутранай службы РСЧА, літаратура па балістыцы стралковай справы.

Намеснік загадчыка ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Ключынскі і сакратар гаркома КП(б)Б тв. Власаў спыніліся ў сваіх выступленнях на бліжэйшых задачах абароннага актыва Мінска ў справе далейшай перабудовы і рашучага палепшэння вучэбнай работы Асоавіяхіма.

У прынятай пастанове абароннага актыва абавязаўся шырока раз'яснць значэнне новага комплекснага абучэння, стварыць вучэбныя падраздзяленні ва ўсіх пярвічных асоавіяхімаўскіх арганізацыях, ахапіць новыя тысячы працоўных горада падрыхтоўкай па розных ваенных спецыяльнасцях.

Л. ГОРФІНКЕЛЬ.

У КАРЦІННАЙ ГАЛЕРЭІ БССР

8 лістапада ў дзень XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі пасля капітальнага рамонту ў Мінску зноў адкрыецца карцінная галерэя БССР.

Карцінная галерэя будзе адной з буйнейшых у Совецкім Саюзе. У ёй будуць сабраны мастацкія карціны і скульптуры лепшых майстраў кісці і лепкі Беларусі і Совецкага Саюза. Рапей галерэя займала толькі адзін паверх будынка. Зараз экспанаты размеснцца ў залах усіх трох паверхаў. Увесь першы паверх адведзен для аддзела народнай творчасці. У залах другога паверха будуць выстаўлены работы такіх выдатных майстроў, як Альперовіча, Пэна, Кругера, Пархоменка і інш., а таксама маладых совецкіх мастакоў. У залах 3-га паверха будуць выстаўлены работы майстраў рускага мастацтва, пачынаючы з XVIII стагоддзя.

Галерэя мае звыш тысячы экспанатаў жывапісу, графікі, скульптуры і прыкладнога мастацтва. Фонд яе папаўняецца новымі творамі мастакоў і скульптараў. Так, днямі галерэя атрымае вялікае палатно, размерам 5×3 метры, маскоўскага мастака Малорава—«Народнае Сабранне ў Беластоку». Чакаецца таксама рад работ для карціннай галерэі віцебскіх мастакоў тт. Ахрэмчыка і Хрусталёва.

ЛЕКЦЫЯ АБ ТВОРЧАСЦІ АДАМА МІЦКЕВІЧА

БРЭСТ. (Кар. «Звязды»). У Доме пт[illegible]тыйнай асветы была прачытана лекцыя аб творчасці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. Лектар — выкладчык польскай мовы і літаратуры тав. Ра[illegible] поўскі расказаў аб асноўных матыў[illegible] творчасці паэта—барацьбіта за шчасце [illegible] дружбу народаў, паказаў, за што любі[illegible] Міцкевіча ўсе народы Совецкага Саю[illegible]. Такая-ж лекцыя была прачытана для [illegible] стаўнікаў горада.

У сувязі з набліжэннем 85-годдзя з [illegible] смерці Міцкевіча аддзел прапаганды і а[illegible] цацыі гаркома партыі намеціў правесці [illegible] прадпрыемствах і ва ўстановах рад папуля[illegible]ных лекцый і дакладаў на польскай, р[illegible]кай і яўрэйскай мовах аб творчасці [illegible]лікага паэта.

Хроніка

Соўнарком СССР зняў т. Іняшкіна М. з пасады намесніка Народнага Камісар[illegible] Боепрыпасаў (па кадрах).

Намеснікам Народнага Камісара Боепрыпасаў (па кадрах) назначан т. Ніголкін П. (ТАСС).

Нам. адказнага рэдактара І. Б. ШЛЯФЕ[illegible]

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР
30 кастрычніка СПЕКТАКЛЬ для школьнікаў КВЕТКА ШЧАСЦЯ
Пачатак у 6 г. 30 м. веч.
Бліжэйшая прэм'ера «ТРЫЛЬБІ»
Рыхтуецца да пастаноўкі «ПІКАВАЯ ДАМА»

Першы Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр.
30 кастрычніка СТРАШНЫ СУД
Пачатак спектакля ў 8 г. вечара.
Каса адкрыта з 2 г. дня.
Па калектыўных заяўках прадастаўляецца скідка.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР
30/X—ІВЕЙ КУНІЛЕМЛЭХ
31/X—ПІВЕСТЭР
Пачатак у 8 г. 30 м. вечара
Бліжэйшая прэм'ера «ЗА ОКЕАНОМ»

Кінотэатр «Навіны дня»
1. Журнал «Совецкая Беларусь» № 59
2. Журнал «Советское искусство» № 7
3. Маленькі Мук (мультыплікацыя)
4. Навукова-папулярны фільм «Солнечное и лунное затмение».

Кінотэатр «Чырвоная зорка» «СТАНЦЫЯ ДАЛЬНЯЯ»
Кінотэатр «Родина» «НОВЫЕ ВРЕМЕНА»
Кінотэатр «Інтэрнацыянал» «ВАСИЛИСА ПРЕКРАСНАЯ»
Кінотэатр «1 Мая» «ИУДУШКА ГОЛОВЛЕВ»
Дзіцячы кінотэатр АСАЛЬ

БЕЛМЕХГАНДАЛЬ ПРАВОДЗІЦЬ скупку старых футраў і футравых вырабаў ад насельніцтва
ў наступных магазінах і скупачных пунктах:
МІНСК — футравы магазін № 1 — Ленінская, 16.
МІНСК — футравы магазін № 2 — Совецкая, 57.
ГОМЕЛЬ — футравы магазін № 3 — Совецкая, 2.
МАГІЛЁЎ — футравы магазін № 4 — Першамайская, 19.
ВІЦЕБСК — футравы магазін № 5 — вул «Правды», 3
БАБРУЙСК—футравы магазін № 6—Социялістычная, 122
БЕЛАСТОК — футравы магазін № 7 — Совецкая, 38.
БРЭСТ — футравы магазін № 8 — Совецкая, 37.
СКУПАЧНЫЯ ПУНКТЫ — У БЕЛАСТОКУ І ПІНСКУ.

НАВЕДАЙЦЕ МІНСКІ УНІВЕРМАГ!
/СОВЕЦКАЯ 43/
і яго філіялы: ДЗІЦЯЧЫ /рог. вул. ЛЕНІНСКАЙ і СОВЕЦКАЙ/ і ТЭКСТЫЛЬНЫХ ВЫРАБАЎ /пл. СВАБОДЫ 35/.
МАГАЗІНЫ АДКРЫТЫ З 10 РАНІЦЫ ДА 8 г. ВЕЧАРА, БЕЗ ВЫХАДНЫХ ДЗЁН.
УНІВЕРМАГ і ФІЛІЯЛЫ ГАНДЛЮЮЦЬ ТАВАРАМІ ПАЛЕПШАНАГА АСАРТЫМЕНТА.
Да Святочных дзён у продажы ёсць вялікі выбар тавараў:
тканіны розныя — сукно, шоўк, шэрсць, лён і баваўняна-папяровыя; абутак, гатовае адзенне, трыкатаж, бялізна, чулкі, наскі, футры, галаўныя ўборы, музыкальныя інструменты, патэфоны, грамплясцінкі, фотаапараты, радыё, электратавары, спорттавары пасуда, цацкі, галянтарэя, парфумерыя і рад іншых тавараў
ВЯЛІКІ ВЫБАР ТАВАРАЎ ДЛЯ ПАДАРУНКАЎ.

НАРКАМЧОРМЕТ СССР
„ГЛАВВТОРЧЕРМЕТ“
ПРАВОДЗІЦЬ ЗАГАТОЎКУ
ЛОМУ ЧОРНЫХ МЕТАЛАЎ
ЧЫМ БОЛЬШ ЗБЯРОМ ЛОМУ, ТЫМ БОЛЬШ БУДЗЕ ВЫПЛАЎЛЕНА СТАЛІ, ТЫМ БОЛЬШ ДАДЗІМ КРАІНЕ НОВЫХ МАШЫН, СТАНКОЎ, ТРАКТАРАЎ, ПАРАВОЗАЎ, ВАГОНАЎ, ТЫМ СІЛЬНЕЙ УМАЦУЕМ АБАРОНУ НАШАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЫ.
РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ! ІНЖЫНЕРЫ І ТЭХНІКІ!
АРГАНІЗУЙЦЕ старанны збор, сартыроўку і перапрацоўку лому чорных металаў.
НЕ ДАПУСКАЙЦЕ страт метала з-за няправільнай арганізацыі збору і неахайнага яго хавання, СТАРАННА САРТЫРУЙЦЕ САБРАНЫ ЛОМ ПА ГРУПАХ І МАРКАХ.
ЗАБЯСПЕЧЦЕ да наступлення зімы ачыстку тэрыторый вашых прадпрыемстваў ад лому чорных металаў.
САЧЫЦЕ, каб ні адзін кілограм лому не застаўся нескарыстаным.
РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ СОЎГАСАЎ, МТС І МТМ! КАЛГАСНІКІ І КАЛГАСНІЦЫ!
У кожным калгасе, соўгасе, МТС і МТМ, у кузнях і майстэрнях, у кожным калгасным двары ляжыць многа лому чорных металаў.
ЗБІРАЙЦЕ ЯГО І ЗДАВАЙЦЕ БЛІЖЭЙШЫМ ЗАГАТОЎЧЫМ ПУНКТАМ.
Арганізуйце вывазку лому на пагрузачныя пункты чыгунак сваімі аўтагужавымі траспартам.
Лом чорных металаў на ўсіх прамысловых прадпрыемствах прымаюць упаўнаважаныя кантор і аддзяленняў «Главвторчермета», а ад СОЎГАСАЎ, КАЛГАСАЎ, МТС і МТМ і ад НАСЕЛЬНІЦТВА — контрагенты «ГЛАВВТОРЧЕРМЕТА»: САЮЗУЦІЛЬ, ПРОМКААПЕРАЦЫЯ і СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫЯ.
Лом аплачваецца па прэйскуранту «Главвторчермета».
ДАСТАЎКА ЛОМУ НА БАЗЫ «ГЛАВВТОРЧЕРМЕТА» АБО ДА ЧЫГУНАЧНЫХ СТАНЦЫЙ АПЛАЧВАЕЦЦА АСОБНА ПА СТАЎКАХ ВЫКАНКОМА АБЛСОВЕТА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА Мінск, Совецкая 49 Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 20-000 (камутатар) дадатковы — 102 Прыёмная рэдактара — 2-13-52 намесніка адказнага рэдактара — 2-51-88, адказнага сакратара — 2-13-53, намесніка адказнага сакратара — 2-24-12 сакратарыята — 2-39-55 Аддзелаў: заг партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56 заг аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-80, заг эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56, літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах і ваенна-фізкультурнай рабоце — 2-18-85 унутранай інфармацыі — 2-13-99, аддзела рабселькораў і пісем працоўных — 2-08-44 і 2-18-45 заг выдавецтва — 2-13-58, бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела абтаў — 2-13-60, выпускаючага — 2-47-68, карэктарскай — 2-13-57.

У3587. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. М., М., Ш.